ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 94 (4346)
АЎТОРАК, 26 красавіка 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ у НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Па-бальшавіцку правесьці навігацыю.
Інж. АВЯР'ЯНАЎ — Яшчэ аб другой пяцігодцы хімічнай прамысловасьці БССР (3 стар.).
ПАЛЯРНЫ — Чырвоны Шанчэн (4 стар.).
Правільная арганізацыя вытворчых брыгад — аснова арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў (3 стар.).
Выкананьне плянаў ссыпкі насеньня — баявая задача партарганізацыі (1 стар.).
Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (1 стар.).
ІХ УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ (2 стар.).
Да ўсіх рабочых, калгасьнікаў і ўсяго працоўнага насельніцтва Койданаўскага раёну (2 стар.).
ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА. Бярэце прыклад з калгасу «Прагрэс» і «Савецкая Беларусь» (2 стар.).
Выкараніць гандлярства і тэндэнцыю мэханічнага разьмерканьня тавараў (2 стар.).
МЯСАЗАГАТОЎКІ — За дзьве дэкады толькі 9,4 проц. пляну (3 стар.).
Вагонную гаспадарку — на ўзровень задач сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту (3 стар.).
Гаспадары Францыі і яе замежнай палітыкі (4 стар.).

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ НАВІГАЦЫЮ

Навігацыя пачалася. Рэчны флёт БССР выступіў у першыя рэйсы. У гэтым годзе перад рэчным транспартам пастаўлены надзвычай вялікія задачы. Яны абумоўліваюцца тэмпамі разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва на ўсіх участках. Да апошняга часу водны транспарт быў «вузкім» месцам, ён адставаў ад агульных тэмпаў разьвіцьця народнае гаспадаркі. Задача заключаецца ў тым, каб пацягнуць яго да ўзроўню перадавых галін народнай гаспадаркі.

Пуск Дняпрабуду, рэканструкцыя сыстэм рэк Дняпро, Бярэзіны, Прыпяці і Заходняй Дзьвіны, якая вызначана ў пастанове СНК і ЦК КП(б)Б аб асноўных установах для складаньня другой пяцігодкі адкрывае вялікія пэрспэктывы перад рэчным транспартам БССР. У сувязі з гэтым яшчэ больш павышаецца адказнасьць за пасьпяховае правядзеньне навігацыі бягучага году.

Паводле пляну рэчны транспарт БССР у бягучым годзе павінен перавесьці 615 тыс. тон грузу (54 млн. тонна - кілёмэтраў). Супроць леташняга плян павялічан больш чым на палову, але ён зусім рэальны. Патрабуецца толькі бальшавіцкая, ўдарная работа. Трэба яшчэ і яшчэ раз праверыць, ці ліквідаваны ўсе тыя недахопы, якія сарвалі выкананьне пляну мінулага году. Ня лішнім будзе нагадаць аб іх: «фармальнае правядзеньне гаспадарчага разрахунку ва ўсіх эльвенных транспарту і асабліва на суднах; ігнараваньне адзіначальля, як досьць рашучая барацьба за старэйшую працыпліну, паяўнасьць у радзе гаспадарчых, партыйных і прафэсіянальных эльвеньняў апартуністычнай стаўкі на самацёк, коснасьць і нецаварытлівасьць у апэрацыйным кіраўніцтве пры зусім пэвыстарчальным разгортваньні партыйна-масавай работы і мабілізацыі рабочых водніка ў на практычнае ажыцьцяўленьне адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, а таксама 6 умоў тав. Сталіна».

Праведзены 9-11 красавіка, па ініцыятыве газэты «Зьвязда» пробны рэйс суднаў рэчнога транспарту БССР паказаў, што леташнія ўрокі ў асноўным улічаны на большасьці прыстаняў, што ў перабудове работы водніцкіх арганізацый ёсьць пэўны зрух.

Пробны рэйс выклікаў творчы ўсплыск сярод масаў водніка ў БССР. **Гомельскія і магілёўскія** водні кі выяўлялі сустрэчныя планы па перавозках, па эканоміі палівы і г. д.

Аднак, у выніку пробнага рэйсу выявіліся і адмоўныя моманты. Якасьць рамонту раду суднаў нізкая **(Магілёў , Бабруйск)**. Трансфінплян не прапрацаван на суднах **(Рэчыца, Бабруйск)** і інш.

Задача заключаецца ў тым, каб усе гэтыя недахопы ліквідаваць на хаду. Лёзунгам коснага водніка павінна быць — ніводнай аварыі, ніводнай паўторнасьці рамонту, за пралетарскую дысцыпліну працы.

Трэба канчаткова ліквідаваць абязьлічку на судне, якая ў большасьці сьпяўляецца галоўнай прычынай аварыйнасьці. За кожную канкрэтную галіну работы адказвае работнік адпаведнай кваліфікацыі. Нельга дапушчаць такіх фактаў, якія мелі месца летась, калі работнікі перакідваліся з аднаго судна на другое.

Прапрацоўка трансфінпляну на суднах мае выключна важнае значэньне. Кожны водзік павінен ведаць выгадворчы плян свайго судна, каб па-ўдарнаму, шляхам сацыяборніцтва, эмагацца за яго выкананьне і перавыкананьне. Прапрацоўку пляну трэба правесьці неадкладна, у бліжэйшыя дні.

Партнарада Дняпра - Дзьвінскага рэчнага транспарту патрабавала ад усіх гаспадарчых, партыйных і прафэсіянальных арганізацый **«карэнная перабудовы сыстэмы ўсёй работы ў напрамку практычнай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, жорсткай барацьбы з усімі праяўленьнямі апартунізму, бюракратызмам, коснасьцю і непаваротлівасьцю апарату, пры ўстаноўленьня цьвёрдага апэрацыйнага кіраўніцтва ўсімі зьвеньнямі гаспадаркі воднага транспарту»**. Гэта асноўнае, што забясьпечвае выкананьне трансфінпляну 1932 году.

Якое становішча мы маем зараз па гэтых пытаньнях? Трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што дырэктыва партыі аб пераводзе на гаспадарчы разрахунак суднаў і прыстаняў праводзіцца надзвычай марудна. У Бабруйску, Рэчыцы і па іншых прыстанях **гаспадарчы разрахунак фактычна адсутнічае.** Не наладжаны выразны ўлік. Вынікі работы не даводзяцца да водніка ў.

Правядзеньне дысцыплінарскай сыстэмы мае вялікае значэньне для пляначай, выразнай работы рэчнага транспарту. Аднак, ня ўсюды гэта ацэнена. Адсутнасьць тэлефоннай сувязі зрывае дысцыплінарызацыю ў Гомелі і Віцебску.

Ня гледзячы на рад папярэджаньняў ЦКК НК-РСІ, да гэтага часу не заключана заключэньне дагавораў на ўсю суму перавозак, слаба ідзе падвозка грузаў да прыстаняў (Віцебск Бабруйск, Магілёў, Гомель). Водніцкія арганізацыі ня ўжылі ўсіх мер, каб рэалізаваць пастанову партыі і ўрада па гэтым пытаньні. Мясцовыя арганізацыі не дапамагалі водзікам, каб прымусіць клієнтуру своечасова заключыць дагаворы і падвезьці грузы.

Пагрузачна-разгрузачныя работы — слабае месца ў працы рэчнага транспарту. Ня гледзячы на тое, што плян перавозак у гэтым годзе значна большы чым летась, мэханізацыя пунктаў пагрузкі і выгрузкі праведзена зусім нездавальняюча. 6 транспарцёраў «на кэнзоны», якія атрыманы для Дняпра-Дзьвінскага рэчнага транспарту, да гэтага часу не ўстаноўлены. Трэба ўжо сыгналізаваць, што непрыняцьце рашучых мер да наладжаньня пагрузачна-разгрузачных работ можа прывесьці да зрыву выкананьня пляну. Аб гэтым лепш за ўсё сьведчаць вынікі першага рэйсу ў Гомелі. З прычыны дрэннай падрыхтоўкі да пагрузачна-разгрузачных работ з боку клієнтуры і кіраўніцтва рэчнага транспарту, ужо ў першым рэйсе былі затрыманьні непаравога флёту. З-за непрасрадчасьці начальніка прыстані Гомель і капітанаў былі затрыманьні і параходаў. Першыя недахопы павінны быць апошнімі. Трэба па-бальшавіцку змагацца за максымальна эфэктыўнае скарыстаньне як паравога, так і непаравога флёту. Ніводнай гадзіны непрадукцыйнага прастою, ніводнай гадзіны спазьненьня, за выразны графік руху, за поўную нагрузку судна—такава задача.

Партнарада ДДРТ вынесла пастанову аб тым, каб у першую палову навігацыі перавезьці ня менш 60 проц. грузаў, якія вызначаны плянам. Гэта баявое заданьне, за рэалізацыю якога, пад кіраўніцтвам партарганізацыі, павінны змагацца ўсе водзікі БССР.

Арганізацыя забесьпячэньня водніка ў у часе навігацыі—важнейшая ўмова выкананьня пляну. Тут яшчэ ня ўсё зроблена. Пастанова партнарады ДДРТ аб арганізацыі ў месцах масавага руху берагавых крам з кругласутачнай работай (Гомель, Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Віцебск, Магілёў), аб узмацненьні самазагатовак і паляпшэньні забесьпячэньня прадуктамі харчаваньня плывучых крам, сталовак берагавых і на параходах—канкрэтная праграма работы водніцкай каапэрацыі.

Палітычна-масавая работа сярод водніка ў да апошняга часу была дрэнна наладжана. Зусім відавочна, што бяз гэтага, бяз шырокай палітычна-масавай работы, без мабілізацыі мас цяжка гаварыць аб выкананьні пляну перавозак. На аснове бальшавіцкай пастаноўкі палітмасавай работы забясьпечым узьдым сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, выкананьне пляну навігацыі.

Поўнасьцю рэалізуючы 6 умоў тав. Сталіна, праводзячы цьвёрдае адзіначальле, на хаду выпраўляючы недахопы падрыхтоўкі і першага рэйсу, водніцкія арганізацыі БССР, на чале з ЦК РВТ, ужо ў першым рэйсе былі затрыманьні непаравога флёту. 3

Да ўсіх рабочых, калгасьнікаў і ўсяго працоўнага насельніцтва Койданаўскага раёну

АДОЗВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Таварышы!

«Уся гісторыя барацьбы дзьвёх сыстэм—капіталістычнай і сацыялістычнай—з вычарпальнай яснасьцю даказала, што толькі ў лягеры саветаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, згуртаваўшы вакол сябе большасьць насельніцтва — зрабілася магчымым вынішчыць у корані нацыянальны ўціск, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і запажыць асновы брацкага супрацоўніцтва народаў» (Канстытуцыя СССР).

Савецкая Беларусь, уваходзячы ў Саюз ССР, зьяўляецца неадрыўнай яго часткай. Працоўныя масы БССР, разам з працоўнымі масамі ўсяго Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, на падставе генэральнай лініі камуністычнай партыі, пасьпяхова будуюць сацыялізм. Рост разгорнутага контрэвалюцыйнага нацыяналістычнага дэмакратызму, супроць польскага, яўрэйскага, літоўскага і інш. шавінізмаў. Разьбіваючы адзіны нацыянальны буржуазны фронт, рабочая клясьа, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, змагаецца за адзіны інтэрнацыянальны фронт працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Крок за крокам у цесным саюзе і пры падтрыманьні ўсяго Саюзу ССР, Савецкая Беларусь—эсходні форпост Савецкага саюзу—пасьпяхова перамагае эканамічную і культурную адстапасьць — спадчыну царызму, з краіны заміраньня, мракултурнай у мінулым пераўтвараецца ў краіну індустрыяльна-калгасную, у краіну суцэльнай пісьменнасьці, з краіны спажывецкай—у краіну высока-таварнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Рабочая клясьа БССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі бальшэвікоў Беларусі, пераможна будуе культуру, пралетарскую па зьместу і нацыянальную па форме, рашуча і пасьпяхова вынішчаючы рэшткі эканамічнай і культурнай адстапасьці прыгнечаных раней нацыянальнасьцяй.

Посьпехі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі зьяўляюцца яркім прыкладам правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая посьпядоўнаажыцьцяўляецца ў Савецкім саюзе.

Працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй, якія насяляюць Савецкую Беларусь, у тым ліку польская нацыянальнасьць, цьвёрда і беспаваротна сталі на шлях сацыялізму і, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядуць ліпсьмную барацьбу на фронце вялікай сацыялістычнай будоўлі, перамагаючы ўсялякае супраціўленьне клясавых ворагаў, вядучы бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» апартуністамі і з усімі прыміранцамі. Польскія рабочыя разам з усёй рабочай клясай вялікай Савецкай краіны, ажыцьцяўляючы дыктатуру пралетарыяту, пасьпяхова змагаюцца за выкананьне пяцігадовага пляну, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Вялізарнейшыя дасягненьні, якіх мы дабіліся ў галіне індустрыялізацыі краіны, абумовілі посьпех сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі па шляху яе калектывізацыі. Гэтыя-ж вялізарныя зрухі адбыліся і ў польскай вёсцы.

Апошнія гады сацыялістычнага будаўніцтва характарызуюцца выключна шпарким ростам польскіх калгасаў. Калі ў 1930 годзе ў БССР было 66 польскіх нацыянальных калгасаў, дык у сярэдзіне 1931 году іх было ўжо 84.

Польскія рабочыя, калгаснікі, батракі, беднякі, сераднякі—аднаасобнікі прымаюць актыўны ўдзел у справе кіраваньня дзяржавай. Зараз у БССР налічваецца 36 польскіх нацыянальных сельскіх саветаў.

З кожным годам расьце колькасьць польскіх нацыянальных навучальных устаноў, школ, піўнктаў. Дзеці працоўных палякаў ахоплены ўсеагульным навучаньнем на роднай мове. На польскай мове выдаецца літаратура, расьце польскі нацыянальны друк, пралетарскае мастацтва.

Новай буйнай перамогай ленінскай нацыянальнай палітыкі, новым магутным фактарам эканамічнага і культурнага ўздыму польскіх працоўных мас зьяўляецца рэарганізацыя Койданаўскага раёну ў нацыянальны польскі раён. Рэарганізацыя Койданаўскага раёну дзе пераважную большасьць насельніцтва складаюць працоўныя палякі, у нацыянальна польскі — яшчэ больш узьніме актыўнасьць працоўных палякаў, уцягне самыя шырокія масы працоўных у гаспадарча-палітычнае жыцьцё раёну, у практычную работу па сацыялістычным будаўніцтве.

Пасьпяховае вырашэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі забясьпечваецца рашучай барацьбой рабочай клясы і ўсіх працоўных пад кіраўніцтвам партыі супроць шавінізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага контрэвалюцыйнага нацыяналізму-дэмакратызму, супроць польскага, яўрэйскага, літоўскага і інш. шавінізмаў. Разьбіваючы адзіны нацыянальны буржуазны фронт, рабочая клясьа, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, змагаецца за адзіны інтэрнацыянальны фронт працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Саюзу ССР і БССР асабліва відавочны на фоне ўсеагульнага эканамічнага крызісу капіталістычнага сьвету. Там, у краінах капіталу, ідзе бязьлітаснае наступленьне на матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочай клясы. Павялічваецца беспрацоўе. Зьніжаецца зарплата. Адбываецца масавае зруйнаваньне працоўнага сялянства. Узрастае нацыянальны ўціск і эксплёатацыя прыгнечаных народаў калёній і паўкалёній. У новай крызісай бойцы капіталісты імкнуцца знайсьці выхад з эканамічнага крызісу. У зьвярыным страху перад надыходзячай сусьветнай пралетарскай рэвалюцыяй, вядучы падрыхтоўку вайны супроць ССР, капіталісты імкнуцца фізычна зьнішчыць пепшую, найбольш сьвядомую частку рабочай клясы і працоўнага сялянства. Турмы і засьцянкі капіталістычных краін перапоўнены рэвалюцыянэрамі. У краінах буржуазнай «дэмакратыі» шалее нячуваны белы тэрор. У нас, у краіне дыктатуры пралетарыяту, на базе нябывалых тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі, няўхільна павышаецца эканамічны і культурны ўзровень працоўных мас.

У процілегласьць капіталістычнаму сьвету Савецкі Саюз праводзіць пасьпяховую і няўхільна палітыку міру, выкрываючы падпальшчыкаў новай імпэрыялістычнай вайны.

Таварышы рабочыя, калгаснікі, беднякі, сераднякі і ўсе працоўныя Койданаўскага раёну! Савецкая Беларусь, разам з усім Савецкім саюзам, заканчвае выкананьне першай пяцігодкі, заканчвае выкананьне пляну чацьвертага, завяршальнага году. Вялізарныя перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва за час першай пяцігодкі стварылі ўмовы для пастаноўкі вырашэньня яшчэ больш вялікіх задач другой пяцігодкі. «Асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі, — гаворыць постанова XVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі, — зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул. Поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя супярэчнасьці і эксплёатацыю і перамаганьне пережыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Каб сапраўды падрыхтавацца да другой пяцігодкі, працоўныя ўсяго Савецкага саюзу і працоўныя Койданаўскага раёну павінны мабілізаваць усе свае сілы на пасьпяховае вырашэньне задач бягучага заключнага году першай пяцігодкі. Рабочыя гарадоў з гонарам змагаюцца за колькаснае і якаснае выкананьне прамфінпляну. Калгаснікі, беднякі-сераднякі масы сялянства павінны ўзмацніць сваю барацьбу за далейшую сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — гэтай асноўнай задачы калгаснага будаўніцтва, разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, узьнаўленьня ўраджайнасьці, аўладаньня агратэхнікай, арганізацыі пераапрацоўкі сельска-гаспадарчага сырцу.

Мы знаходзімся ў паласе веснавой сяўбы. Пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны мае вялізарнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Таму пасьпяховае выкананьне пляну веснавой сяўбы зьяўляецца палітычным экзаменам для кожнага саўгасу, калгасу, для ўсяго бядняцка-серадняцкага сялянства і вымагае ад нас напружанай работы.

Вырашэньне ўсіх гэтых задач магчыма толькі на аснове далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, крытыкі і самакрытыкі, на аснове рашучага ажыцьцяўленьня 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, на аснове згуртаваньня ўсіх працоўных вакол камуністычнай партыі.

Далейшае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і вырашэньне вялізарных задач другой пяцігодкі будзе выклікаць абавостраньне клясавай барацьбы ў паасобных моманты і асабліва ў паасобных раёнах і паасобных вучастках сацыялістычнай будоўлі. Гэта вымагае ад нас далейшага ўмацаваньня клясавай пільнасьці для своячасовага руйнуючага адпору ўсялякім вылазкам з боку пінучых рэштак капіталізму, кулакоў, контр-рэвалюцыйных, антысавецкіх элемэнтаў.

Напружанасьць міжнародных абставін, пагроза новай імпэрыялістычнай вайны, накіраванай у першую чаргу супроць Савецкага саюзу, прымушае нас з асаблівай уважлівасьцю адносіцца да справы ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны Саветаў і ўзмацненьня баяздольнасьці нашай Чырвонай арміі.

Таварышы! 27 красавіка адкрываецца зьезд саветаў Койданаўскага польскага нацыянальнага раёну. Гэты зьезд павінен адбывацца пад знакам мабілізацыі ўвагі і сіл працоўных Койданаўскага раёну і ўсёй БССР на пасьпяховае выкананьне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва, у прыватнасьці, на своячасовае і якаснае правядзеньне бальшавіцкай сяўбы.

Зьезд саветаў Койданаўскага польскага нацыянальнага раёну павінен падвесьці вынікі вялізарнай работы за мінулы час у галіне гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Гэты зьезд павінен выпрацаваць праграму практычных задач гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва на далейшы час.

Рабочыя, калгаснікі, беднякі, сераднякі і ўсе працоўныя Койданаўскага раёну! Вы павінны адзначыць зьезд саветаў жывым адказам працоўнага энтузіязму, жывой магутнай хваляй сацыялістычнага спаборніцтва. Кожнае прадпрыемства, кожны саўгас, кожны калгас, кожны сельсавет, кожная школа і іншая культурная ўстанова павінны праверыць, у якой ступені яны выканалі свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай.

Выкананьне прамфінпляну, поўнае выкананьне пляну веснавой сяўбы, выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па разгортваньні і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, выкананьне абавязкаў па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, — вось што павінна стаяць перад кожным працоўным БССР і працоўнымі Койданаўскага раёну.

Койданаўскі раён знаходзіцца на рубяжы Савецкага саюзу і капіталістычнага сьвету. Ён павінен служыць прыкладам у барацьбе за сацыялізм. Утварэньне польскага нацыянальнага раёну павінна яшчэ больш шчыльна згуртаваць польскія працоўныя масы і працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй Койданаўшчыны вакол камуністычнай партыі для далейшага бальшавіцкага наступленьня па ўсім фронце за поўную ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, за пабудову бясклясавага грамадзтва, за камунізм.

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ КОЙДАНАЎШЧЫНЫ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ І ПРАВАДЫР СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ТАВ. СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ САЮЗ ССР — БАЦЬКАЎШЧЫНА ПРАЦОЎНЫХ УСІХ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЙ!

ПАЛКАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ПОЛЬСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РАЁНУ!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

23 красавіка 1932 г.

ІХ УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ

Заключнае слова тав. ШВЭРНІКА

На ранішнім пасяджэньні 24 красавіка зьезд прафсаюзаў заслухаў заключныя словы дакладчыкаў—старшыні рэвізійнай камісіі УсесЦСПС тав. **Падасенава** і сакратара УсесЦСПС тав. **Швэрніка.** Сход адбываўся пад старшынствам **тав. Сокалава** (Паўночны Каўказ).

Актыўнасьць, праяўленая зьездам пры абгаварэньні справаздачнага дакладу УсесЦСПС,—сказаў **тав. Швэрнік,**—сьведчыць аб тым, што зьезд па сутнасьці разабраўся ў асноўных пытаньнях дзейнасьці УсесЦСПС. 286 чал. выступіла яшчэ ў завочных спрэчках. Гэта апошняя форма спрэчак, арганізаваная газэтай «Труд», мае надзвычай вялікае значэньне, даючы магчымасьць усім без выключэньня дэлегатам прыняць непасрэдны ўдзел у абгаварэньні дакладу.

Тав. Швэрнік указаў, што спрэчкі адзначаліся багатым зьместам і насілі дзелавы характар, аднак, трэба было падпарадкаваць яшчэ большай крытыцы дзейнасьць УсесЦСПС, ЦК прафсаюзаў і саўпрофаў. Здаровая крытыка недахопаў неабходна для своячасовага зьнішчэньня памылак і хібаў, якія ёсьць у прафсаюзнай рабоце. Тав. Швэрнік падкрэсьліў, што асноўным лёзунгам работы прафсаюзаў павінен быць лёзунг «Тварам да вытворчасьці», за ажыцьцяўленьне 6-ці гістарычных указаньняў тав. Сталіна, указаньняў, якія цалкам закранаюць усе галіны прафсаюзнай работы. Кожны прафработнік павінен рэалізаваць плян правядзеньня гэтых 6-ці указаньняў на сваім вучастку. Мала агітаваць і прапагандаваць, трэба іх рэалізаваць на справе.

У галіне паглыбленьня і пашырэньня рознародных мэтадаў ударніцтва, сацспаборніцтва неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на выяўленьне добрых узораў з тым, каб шпарка пашыраць іх на месцах. Для гэтага неабходна ўзмацніць канкрэтнае кіраўніцтва сацспаборніцтвам. Узмоцненую ўвагу трэба зьвярнуць на якасьць работы ўдарнікаў і гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Вялікую ролю павінны ў далейшым адыграць курсы для паньшэньня тэхнічных ведаў рабочых. Асваеньне поўнай тэхнікі немагчыма без тэарэтычнай вучобы. Інжынэрна-тэхнічны персанал і навуковыя работнікі павінны прыйсьці на дапамогу ўдарнікам. Задачы 2-й пяцігодкі ў гэтай галіне будуць значна больш складанымі і таму асабліва важна падкаваць наш актыў у гэтых адносінах.

Ударнік павінен стаць сапраўдным кіраўніком і арганізатарам мас на вытворчасьці. Але пельга ўсю ўвагу канцэнтраваць выключна на ўдарніку. Масавая вытворчая работа прафсаюзаў павінна ахапіць усіх рабочых без выключэньня. У сувязі з масавым прыцёкам новых рабочых трэба ў самы кароткі тэрмін перавыхаваць іх, дапамагчы ім аўладаць тэхнічнымі прадпісамі, зрабіць іх ударнікамі.

Пара пакласьці канец агульным фразам і гутаркам. Патрэбен больш канкрэтны падыход і веданьне справы. Перабудова зарплаты, правядзеньне тарыфнай рэформы і тэхнічнага нармаваньня, зьнішчэньне абязьлічкі і ўраўнілаўкі ў зарплаце павінны быць цясьнейшым чынам увязаны з вытворчасьцю. Пытаньні зарплаты, тарыфнай рэформы і тэхнічнага нармаваньня—найбольш цяжкія пытаньні. І прафсаюзы павінны вылучыць на гэты вучастак найбольш кваліфікаваных работнікаў.

Самым слабым вучасткам работы нізавых прафарганізацый зьяўляецца задавальненьне патрэб рабочых. Трэба гэты вучастак падцягнуць, сканцэнтраваць на ім лепшыя сілы і зьнішчыць ненармальныя зьявішчы. Прафсаюзныя арганізацыі абавязаны паказаць на канкрэтных прыкладах, як яны змагаюцца за патрэбы рабочых, за ўзоры каапэратыў, за своячасовую дастаўку прадметаў спажываньня, за жылабудаўніцтва, за яго своячасовасьць і добрую якасьць.

— Мы напярэдадні завяршэньня апошняга году пяцігодкі,—заканчвае тав. Швэрнік,—і наша задача заключаецца ў тым, **каб на 100 проц. падрыхтавацца да пачатку 2-й пяцігодкі.** Роля прафсаюзаў у выкананьні 2-й пяцігодкі вялізарная. Прафсаюзы павінны прыняць самы актыўны ўдзел у яе ажыцьцяўленьні. Прафсаюзы павінны стаць сапраўднай школай камунізму для новых мільёнаў рабочых, якія яшчэ прыдуць да нас. Трэба ўзьняць іх палітычную сьвядомасьць, зрабіць сапраўднымі барацьбітамі за сацыялістычнае будаўніцтва.

Посьпехі нашага будаўніцтва значныя, але супакоіцца на іх мы не можам. Нам яшчэ прадстаіць упартая барацьба з клясавым ворагам. Мы павінны даваць жорсткі адпор і правараму апартунізму — як галоўнай небясьпецы на даным этапе, прымірэнцтву, «левым» загібам. Нам трэба так перастроіць свае рады, каб стаць сапраўднымі павадырамі і павесьці ў бой шматмільённыя масы з тым, каб 2-ую пяцігодку выканаць з нямоцным посьпехам, чым першую (**аплёдысмэнты**).

Пасьля заключнага слова тав. Швэрніка зьезд **аднагалосна** ўхваліў наступную рэзалюцыю, запрапанаваную **тав. Чувырыным** і радам дэлегатаў.

«Заслухаўшы справаздачны даклад тав. Швэрніка аб рабоце УсесЦСПС зьезд лічыць правільнай палітычную лінію УсесЦСПС, цалкам і поўнасьцю **ўхваляе яго практычную работу** за **справаздачны пэрыяд,** накіраваную на канчатковае выкараненьне рэштак апартуністычнага збанкрутаванага кіраўніцтва УсесЦСПС і на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі УсесКП(б)».

Потым выбіраецца камісія ў 65 чал. для распрацоўкі практычнай часткі рэзалюцыі. **Аднагалосна** зацьвярджаецца справаздача рэвізійнай камісіі.

Ранішняе пасяджэньне 24-га красавіка

На ранішнім пасяджэньні 24 красавіка з рапортам зьезду выступілі т. т. **Канавалаў** ад імя рабочых дэпо станцыі Браянск—2 (Паўнёва-Заходніх чыгунак), тав. **Боцманаў** ад рабочых мазутнікаў Азнафты.

Працяжнымі воплескамі зьезд сустракае **акадэміка Іофэ,** які выступаў з прывітаньнем ад імя студэнтаў і выкладчыкаў ад **Ленінградзкага фізыка-мэханічнага інстытуту.**

Потым са справаздачай аб рабоце делегацыі УсесЦСПС у Нрафінтэрне выступіў **тав. Лазоўскі.**

Па вячэрнім пасяджэньні пачаліся спрэчкі па дакладу тав. Лазоўскага.

Перавыбары саветаў у Койданаўскім польскім-нацыянальным раёне

САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КОЙДАНАЎСКАГА САВЕТУ БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ

КОЙДАНАВА. (Наш спец. карэспандэнт).

23 красавіка адбыўся арганізацыйны пленум Койданаўскага местачковага савету. Пленум канстатаваў вялізную актыўнасьць працоўных, з якою прайшлі выбары. Значна павялічылася актыўнасьць жанчын-выбаршчыц. Калі ў перавыбарах 1930 году іх удзел складаў 32 проц., дык цяпер гэты ўдзел узрос да 79 проц.

Пленум асаблівую ўвагу завастрыў па неабходнасьці фарсаваньня торфаздабычы, бо ў раёне местачковага савету ёсьць вялікія паклады торфу і па выкананьні наказу дэпутатам раённага камітэту, а таксама дадаткаў да яго, якія насілі наступны характар: арганізаваць пры калгасах ясьлі, пабудаваць у мястэчку лазьню, пабудаваць польскую сямігодку, паправіць дарогі, а там, дзе яны не забрукаваны, забрукаваць, адрамантаваць да 1 мая ўсе тратуары, галоўную ўвагу зьвярнуць на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, хадайнічаць перад ЦВК аб перайменаваньні мястэчка Койданава ў горад імя Ф. Дзяржынскага і г. д.

Пленум абвясьціў слабе ўдарным па правядзеньні трэцяй бальшавіцкай вясны і яшчэ раз пацьвердзіў неабходнасьць да раённага зьезду саветаў выканаць на менш 10 проц. фінпляну 2-га кварталу (у першым квартале фінплян быў выкананы на 122 проц.). Наколькі рэальна гэта самаабавязацельства, паказвае той факт, што на 20 красавіка местачковае спажыўтаварыства выкапала ўжо 60 проц. фінпляну другога кварталу.

Пленум выклікаў на сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны і выкананьне фінпляну Азерскі сельсавет. Вынесена пастанова хадайнічаць перад ЦВК БССР аб перайменаваньні м-ка Койданава і ўсяго раёну ў горад імя першага чэкіста—Фэлікса Дзяржынскага, а таксама падтрымана хадайніцтва рабочых і служачых ст. Койданава аб перайменаваньні яе ў станцыю імя Дзяржынскага. Пленум пастанавіў хадайнічаць перад райвыканкомам аб пабудове ў мястэчку помніка Ф. Дзяржынскаму.

Выбран прэзыдыум з 7 членаў і двох кандыдатаў, у які ўвайшлі 5 рабочых. Старшынёй местачковага савету выбран тав. **Байдак,** намесьнікам — тав. **Каган.** На раённы зьезд саветаў выбрана 16 дэлегатаў.

М. Сакалоўскі.

Неадкладна выправіць „лявацкія" памылкі

СМАЛЯВІЧЫ Раённыя арганізацыі не сканцэнтравалі ўвагі работнікаў на практычным ажыцьцяўленьні цэнтральнай задачы — арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў у іх сучаснай арцельнай стадыі разьвіцьця.

Зьвялічына ў значнай частцы калгасаў увядзена фармальна, у сапраўднасьці-ж поўнае падзёнічына, абязьлічка, ураўнілаўка. Разьмеркаваньне даходаў у частцы калгасаў праведзена па сям'ях, ядакох, а не па прынцыпе «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае».

Новаарганізаваныя калгасы не аформлены, ня выконваюць статуту сельска-гаспадарчай арцелі. Кіраўніцтва калгасамі «наогул» прывяло да таго, што ў радзе месц панае безгаспадарчасьць, а некаторыя арцелі зусім спынілі («Чырвоная зьмена» і інш.). Бюро райкому толькі 4 сакавіка вынесла пастанову «аб практычным правядзеньні статуту с.-г. арцелі», у якой, аднак, цапускае рад пазітычных памылак.

Замест сапраўднай мабілізацыі калгасных мас на ажыцьцяўленьне статуту, на замацаваньне арцельнай формы разьвіцьця калгасаў, бюро РК КП(б)Б у сваёй пастанове дапускае: «Правесьці абмежаваньне прысядзібных зямель да 0,20 га на сям'ю да 5 душ і да 0,30 га вышэй 5 едакоў. **У паасобных выпадках** пасьля абрэзкі сядзіб дапусьціць надзяленьне гарадамі ня больш 10-15 сотак батрацкіх, бядняцкіх і маламоцных сераднясіх гаспадарак».

Далей райком растлумачвае, што пад прысядзібнымі землямі трэба лічыць зямлю, занятую пад жыльлём і гаспадарчымі будынкамі, пад садам, прысядзібнымі сенажацямі і г. д. Такім чынам, для гарадоў зусім нічога не застаецца, таму, што будынкі і інш. у сярэднім займаюць 35 сотак, а трэба пры абрэзцы ягодна дыяктыны райкому падпусьць толькі 20-30 сотак.

Райком абавязаў фракцыю РВК і райкалгасаюзу скопчыць «абрэзачную рэформу» да 15 красавіка т. г.

«Лявацкая» дырэктыва Смалявіцкага райкому нічога згульнага ня мае з лініяй партыі. ЦК УсесКП(б) у пастанове ад 4 лютага падкрэсьліў, што «спробы штучнага паскарэньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на сучаснай стадыі разьвіцьця калгасаў зьяўляецца сур'ёзнай небясьпекай».

Паперавор пастанове ЦК смалявіцкія «левакі» ігнаруюць арцель, яны парушылі адміністрацыйным парадкам абрэзаць сялібы да 0,20 га і «ў асобных выпадках» батраком, бядняком і маламоцным сераднякам даць ня больш 10-15 сотак гароду.

Работнікі Смалявіцкага району ня ўлічылі ўрокаў Койданава, яны не зразумелі, што арцель ад камуны тым і адрозьніваецца, што тут яшчэ застаецца прыватная ўласнасьць: хата, гарэты, жарэва, дробная жывёла, што згодна статуту агрэгаваецца толькі асноўныя сродкі вытворчасьці.

Лістападаўскі абъяднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б сусім выразна падкрэсьліў, што ісьціна толькі там, дзе пад шыцдай сядзібнай зямлі фактычна захоўваюцца індывідуальныя гаспадаркі, патрэбна «хаваць» ініцыятыву перадавых калгаснікаў, пазіраваную на пераглядзе разьмеркаваньня сядзібных вучасткаў у бок іх скарачэньня». Гэтага патрабуе статут с.-г. арцелі.

Пры чым пераглядзе павінен быць зроблен, як падкрэсьлівае пленум у сваёй пастанове, на аснове шырокага разгорнутай масавай растлумачальнай работы сярод калгасных мас, пры ўдзеле саміх мас. Смалявіцкі райком зрабіў якраз наадварот, пазбавіўшы абрэзаць усе сядзібы ў адміністрацыйным парадку, без разгортваньня масавай работы, бяз удзелу саміх мас. З гэтым яго грубейшая палітычная памылка.

У тэй-жа пастанове ад 4 лютага ЦК УсесКП(б) **перасьцерагаў** «супроць падмены работы праўленьняў калгасаў голым адміністраваньнем з боку партыйных і савецкіх арганізацый». Але і гэта ня было ўлічана Смалявіцкім райкомам.

На сёньняшні дзень голае адміністраваньне на раёне давялі распаўсюджана. Напрыклад, у Прыленскім сельсавеце была складзена камісія, якая хадзіла па гумнах і хлявох калгаснікаў і ў адміністрацыйным парадку забірала ліпкі кармоў. У гэтым-жа сельсавеце інспэктар райфінагентуры **Гірко** ў калгаснікаў калгасу «Чырвоны маяк» правёў масавую неакопную канфіскацыю маёмасьці. Райком на такія агідныя зьявішчы не рэагаваў.

Смалявіцкая партарганізацыя павінна неадкладна выправіць памылкі «лявацкага» напраўленьня, рашуча ўдарыць на «левакох», якія жывуць правы ўхіл—галоўную небясьпеку на даным этапе.

А. Залескі.

Выкараніць гандлярства і тэндэнцыі мэханічнага разьмеркаваньня тавараў

Мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, разгортваньне самазагатовак—у цэнтр увагі

Удзельная вага прадпрыемстваў Барыскава ў прамысловасьці БССР даволі значная. Тут сканцэнтраваны такія буйныя прадпрыемствы як «Пралетарская перамога», гута імя Дзержынскага, дрэваапрацоўчы камбінат «Камінтэрн», адзінае ў рэспубліцы макаронная фабрыка імя Леніна і г. д.

Барысаў таксама вяжнейшы сьлёзны пункт. Праз Барозінскую артэрыю праходзіць 25 проц. усяго сьлёзу БССР.

Зусім зразумела, што галная задача ўсёй спажывецкай каапэрацыі раёну і ў першую чаргу ЦРК — падпарадкаваць сваю работу выкананьню вытворчых пляноў, пакідаць бесьпрацоўнае спажыўсьпажыцьцё — спрацуюся з гэтай задачай?

Такое пытаньне тым больш актуальна, што 12 мая спаўняецца гадавіна апублікаваньня пастарыгнай адозвы ЦК УсесКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу аб перабудове спажывецкай каапэрацыі. Азнаямленьне з работай ЦРК паказвае, што яго былое (зараз зьнятае) кіраўніцтва не перабудавалася па-новаму, што ЦРК падчас ня лічыўся з інтарэсамі спажывца, груба сказаў дырэктывы партыі аб самазагатоўках, а ў радзе выпадкаў скаціўся на рэйкі гандлярства.

У апраўданьне пасьдоўнасьці працаваць па-новаму, пераразуменьне кіраўніцтвам ЦРК сутнасьці савецкага гандлю работнікі каапэрацыі выстаўлялі доказы таго, што ў іх не хапае тавараў, працаўнікоў, што іх пакрыўдзілі пры выдзяленьні ЗРК, фэрмы, хлебазаводу, што «шопчы» у Барысаве «засаблівыя ўмовы»...

Так адну на другую пазіцыюць «аб'ектыўныя прычыны», за якія работнікі ЦРК прабавалі схавацца.

Год пасьля апублікаваньня спайскай адозвы праўда для іх амаль бясьсьледна. Барысаўскія каапэратары ніяк ня могуць адмовіцца ад мэханічнага разьмеркаваньня тавараў, што атрым [illegible] ня могуць перайсьці на рэйкі савецкага гандлю.

На нарадзе каапэрацыйных работнікаў, скліканай брыгадай «Зьвязды», з усёй відавочнасьцю выявілася, што ЦРК ня выканаў дырэктыў партыі аб перабудове каапэрацыі.

Магазын, як цэнтральнае зьвяно гандлёвай сеткі, ня стаў у цэнтры ўвагі ЦРК. **Крамная сетка ў першым квартале працавала бяз усякага гандэфінпляну.** На 20 красавіка магазыны на мелі гандэфінпляну на другі квартал ў той час, як гэтыя пляны паводле калдагавору павінны быць складзены за пяць дзён да наступленьня кварталу. Пры адсутнасьці пляну і наступ пляніраваньні ў рабоце, поўнай нагрузкі на кожнага прадаўца цяжка мабілізаваць работнікаў прылаўку, каапэрацыйны актыў на выкананьне канкрэтных задач і асабліва па якасных паказальніках.

Аб тым, як кіраўнікі ЦРК зразумелі дырэктыву аб рэнтабельнасьці работы, паказвае факт-б тое, што да гэтага часу **ні адзін магазын, нават найбольш буйны, не пераведзен на гаспадарны разрахунак.** Ня дзіва, што пры такіх умовах тавары астачы растуць, тавараваро[illegible] замарожваецца. Паводле афіцыяльных даных ЦРК, астачы ў сярэднім замест 15 дзён складаюць 18-19 дзён. Фактычна-ж гэтыя астачы значна большыя.

Барысаў у асноўным павінен забясьпечвацца **за лік мясцовых рэсурсаў і напрыканых закупак.** Абавязак ЦРК—сур'ёзна заняцца вышукваньнем дадатковых харчовых і прамтаварных рэсурсаў.

Аднак, гэта важнейшая работа ня была як належыць разгорнута, а магчымасьці ў гэтым напрамку ня выкарыстаны.

Нарэшце, напрыканыя закупкі запалі нарэшце значнае месца ў сыстэме ЦРК — за першы квартал 1932 г. яны склалі 45 проц. ад агульнага тавараабароту. Але калі пазнаёміцца з мэтадамі й якасьцю напрыканых закупак і асабліва самазагатовак, то тут [illegible] у наяўнасьці грубейшыя скажэньні, прыцінаў савецкага гандлю.

Ідучы на лініі найменшага супраціўленьня, ЦРК, паасобныя магазыны пакідаўвалі сваіх работнікаў у Менск, Жэбу, Харкаў для мабілізацыі рэсурсаў па... каапэрацыйных і гандлёвых абъяднаньнях, ігнаруючы ў радзе выпадкаў мясцовую прамысловасьць і прамкаапэрацыю. А загалчык скабянога магазыну № 10 **Кантар** у пагоні за прыбыткам закупляў партыі тэхнічных прылад і перапрадаваў іх па раздробных цэнах гуртам мясцовым прадпрыемствам, лічачы такія апэрацыі па-запляніраваньні закупкамі і разгорнываньнем савецкага гандлю.

З некалькіх дзесяткаў загалчыкаў магазынамі толькі 3-4 праводзяць пазапляніраваныя закупкі. Рэшта работнікаў не праяўляе ініцыятывы, не выкарыстоўвае прадстаўленых правоў.

Самазагатоўкі — найбольш адсталы вучастак. У гэтай галіне ЦРК дапусьціў скажэньні палітыкі партыі, простых тавараабмен. **За тры квартал загатоўлена ў двух прымацаваных раёнах сельска-гаспадарчай продукцыі толькі на 3.287 руб., на ўтрыманьне-ж апарату загатоўчых пунктаў выдаткавана 2.650 руб.** Пратаваравай для стымулываньня адпушчана на 12.873 руб., з іх значная частка ўжо выдаткавана. Аб тэмпах самазагатовак паступ сьведчыць каліб-б тое, што **за квартал па Бягомльскім раёне не загатоўлена ніводнага кілёграма гародніны,** а па Плешчаніцкім раёне за тры месяцы загатоўлена... 430 яек, 7 кілар. мясла і г. д. Загатпункты ЦРК практыкуюць 100-проц. істымулываньне самазагатовак, пранільной простых тавараабмен. ЦРК зусім не клапоціцца аб асартымэнце пратаваравай. **На Плешчаніцкім пункце на працягу дойнага часу па віне галавацкіх з ЦРК ляжаць бяз руху на 3.000 руб. скаварадзі.**

Аб тым, як работнікі ЦРК уяўляюцца спачэньне самазагатовак, сьведчыць тое, што **да гэтага часу не заключан ні адзін дагавор з калгасамі, калгаснікамі на здачу ліцкаў тавар-ной продукцыі.**

Самазагатоўкі праходзяць самацёкам. Работнікі загатпунктаў сядзяць і чакаюць, пакуль ім хто прывязе прадукцыю. Дзіцячыя дамы, бальніцы адчуваюць недахват у некаторых прадуктах, а паводле слоў інспэктара па самазагатоўках — Жывётака, на Бягомльскім пункце тыдні ляжаць ты сячы яек і ніхто яе клапоціцца аб тым, каб дастаніць іх у Барысаў. Такая работа» па лоне барысаўскіх каапэратараў завецца самазагатоўкамі і мабілізацыяй дадатковых харчовых рэсурсаў.

**Пераважн

Мясазагатоўкі

За 2 дэкады толькі 9,4 проц. пляну

Першыя дзве дэкады другога кварталу далі зусім мізэрныя вынікі выканання пляну мясазагатовак. **Квартальны план па рэспубліцы рэалізован на 21 красавіка толькі на 9,4 проц.**

СКТФ здалі 1,9 проц. пляну, МТФ — — 33,9 проц., калгасы — 18,8 проц., калгаснікі — 0,7 проц., па адпаасобкам сэктары загатоўлена 4,3 проц.

Па большасці раёнаў процант выканання пляну значна ніжэй сярэдняга процанту па БССР. Так, напрыклад, Асіпавіцкі раён, які ў другім квартале павінен здаць 2.381 цэнтн. мяса, здаў толькі 5,7 проц., Брагінскі—5 проц., Барысаўскі — 3 проц., Бягомльскі — 5 проц., Гарадоцкі — 3,5 проц., Дрысенскі — 1,4 проц., Чырвонапольскі— 3,1 проц., Лоёўскі — 3,5 проц. і г. д.

Есьць сельсаветы, як Жыліхаўскі, Чырвонаслабодзкага раёну, які па працягу дэкады не загатовіў ніводнага кілёграму мяса. Гэты сельсавет замест таго, каб аддаць пад суд злосных зрыўшчыкаў загатовак жулікоў, шатурае ім. Па Старчынскім і Чапліцкім сельсаветах план выканання больш, як на 1% Па Рагачоўскім раёне дэкада дала прырост толькі на 1 проц.

Паказаныя факты з усёй відавочнасьцю гавораць аб тым, што значная частка раённых і сельскіх арганізацый дэмабілізавалася з фронту мясазагатовак, ня ўвязвае жывёлазагатоўкі в насеўнай і іншымі бягучымі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі.

Аб тым, што мясная таварная прадукцыя на мясцох ёсьць, сьведчаць шматлікія факты разбазарвання мяса на мясцовыя патрэбы.

«Зьвязда» ня раз сьцвердзівала аб абураючых выпадках разбазарвання таварнай прадукцыі, часта пад выглядам самазагатовак і г. д. з боку раду кааперацыйных арганізацый. Гэтыя злачынствы ня спыняюцца. **Кіраўніцтвы чашніцкага райспажыўсаюзу і райзагу за кароткі тэрмін разбазарылі звыш 5 тон мяса з цэнтралізаваных фондаў.**

Прэзыдыум Белкаапсаюзу кваліфікаваў дзеяньні чашніцкіх кааператараў, як буржуазна-рвацкія, як пўпае разбазарваньне дзяржаўных фондаў. **Старшыня райспажыўсаюзу КАРПЕНКА і кіраўнік райзагу АЎРУЦІН зьняты з работы і адданы пад суд.**

Прэзыдыум Белкаапсаюзу ў спэцыяльнай пастанове падкрэсьліў, што за найменшае дапушчэньне самавольнага расходваньня мясных і іншых прадуктаў для мясцовых патрэб звыш пляну, вінаватыя будуць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці, як за буржуазна-рвацкія тэндэнцыі і злоснае растранжыраваньне фондаў рабочага снабжэньня.

Як і ў першым квартале, недапушчальна адстаюць СКТФ. Зусім не разгорнуты жывёлазагатоўкі на **адпаасобным сэктары. Па Веткаўскім і Рагачоўскім раёнах многія сельсаветы не спагналі з кулацка-заможных гаспадарак ні аднаго кілёграму мяса.**

У радзе раёнаў канторы Белзагатжывёлы замест пераключэньня ўсёй увагі на ўдарнае выкананьне пляну, на мабілізацыю вакол гэтай важнай кампаніі ўвагі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас адпаасобнікаў, усё яшчэ займаюцца «рэарганізацыяй» апарату.

Зусім зразумела, што такі самацёк і бязьдзейнасьць з боку некаторых раённых і сельскіх арганізацый толькі граюць на руку клясаваму ворагу і яго агентуры ў імкненьні сарваць снабжэньне пралетарскіх цэнтраў мясам.

Пляны жывёлазагатовак павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін. Гэта патрабуе ад раённых арганізацый, партыйных ячэек, сельсаветаў разгортваньня арганізацыйна-масавай работы, неадкладнага давядзеньня пляну жывёлазагатовак да паасобных сельсаветаў, вёсак, бязьлітасный барацьбы з разбазарваньнем мясной таварнай прадукцыі, узмацненьня паціску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Органы пракуратуры і следзтва павінны прыцягваць да адказнасьці злосных зрыўшчыкаў жывёлазагатовак і тых, хто разбазарвае таварную прадукцыю, разглядваючы іх справы ў найскарацейшы тэрмін.

М. К.

Дэкаднік Беларускай Акадэміі Навук у Віцебску

20 красавіка ў Віцебску распачаўся дэкаднік Беларускай Акадэміі Навук. Дэкаднік праходзіць пад лёзунгамі мабілізацыі шырокіх мас рабочых і працоўных на выкананьне пастановаў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

На ўрачыстым пасяджэньні гаркому КП(б)Б, гарпрафсавету, гарсавету, секцыі навуковых работнікаў быў заслухан даклад аб рабоце Беларускай Акадэміі Навук і аб перспэктывах навукова-дасьледчай работы ў другой пяцігодцы.

21 красавіка ў клюбе мэталістаў, пры перапоўненай залі, рабочымі з вялікай увагай быў выслухан даклад аб крызісе буржуазнай культуры ў капіталістычных краінах і росквіце пралетарскіх па зьместу і нацыянальных па форме культур у СССР.

На фабрыках і заводах Віцебску разгортваецца шырокая работа **па закліку рабочых-ударнікаў у навуку,** па атліду фабрычна-заводзкіх лябараторый, па арганізацыі навукова-тэхнічных гурткоў, па вылучэньні брыгад для вывучэньня матар'ялаў аб гісторыі фабрык і заводаў, збору матар'ялаў па гісторыі грамадзянскай вайны і г. д. Адначасова парт і прафарганізацыі разгортваюць работу **па вярбоўцы рабочых на падрыхтоўчыя адзяленьні інстытуту асьпірантуры БАН.**

Акадэмікі і прадстаўнікі Беларускай Акадэміі Навук наведваюць фабрыкі, заводы, дзе выступаюць на рабочых мітынгах, знаёмяцца з барацьбой рабочых па выкананьні 6 гістарычных умоў т. Сталіна, з выкананьнем прамфінпляну.

ВАГОННУЮ ГАСПАДАРКУ—НА ЎЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ТРАНСПАРТУ

Пасьпяховае выкананьне пароднай гаспадарчага пляну бягучага году патрабуе ад транспарту бесьперабойнай, выключна выразнай работы.

Поўнае выкананьне пляну перавозак з усёй сур'ёзнасьцю высоўнае пытаньне аб найбольш эфэктыўным скарыстаньні рухомага саставу. У гэтым годзе ўваходзяць у эксплёатацыю новыя 1.300 паравозаў і 50.000 вагонаў. Пытаньне аб найбольш рацыянальным скарыстаньні рухомага саставу мае выключна важнае значэньне.

Важнейшай умовай выкананьня пляну перавозак зьяўляецца **«барацьба за беражлівае скарыстаньне транспартных сродкаў вагонаў і паравозаў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад пагрузкай і выгрузкай»** (з пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)).

У даным артыкуле мы маем на ўвазе больш падрабязна спыніцца на пытаньні вагоннай гаспадаркі. Задачы сваячасовага прасоўваньня вясенавых грузаў, будматар'ялаў, задачы асенньга-зімовых перавозак патрабуюць падняцьця якасьці работы вагоннага парку. А між тым, у гэтай частцы ёсьць рад недахопаў.

Возьмем пытаньне звароту вагонаў. Тут ёсьць значнае адставаньне. Толькі адзін **Аршанскі** раён ідзе наперадзе. Ён у сакавіку выканаў норму звароту вагонаў ў суткі на 103,8 проц. Астатнія раёны ня выканалі нормы: **Жлобінскі**—на 25,88 проц. **Гомельскі**—на 10,7 проц.

Аршанскі раён ідзе наперадзе і па выкананьні нормы сярэдня - сутачнага прабегу таварнага вагона (109,2 проц.) і па колькасьці гадзін карыснай работы таварнага вагона ў суткі (0,37 гадзіны перавыкананьня нормы). **Жлобінскі** раён недавыканаў норму сярэдня - сутачнага прабегу таварнага вагона на 20,89 проц., **Гомельскі** — на 7,1 проц., **Віцебскі** — 9,1 проц. Па колькасьці гадзін работы таварнага вагона ў суткі **Жлобінскі** раён недавыканаў норму на 1,74, **Гомельскі** — на 0,63, **Віцебскі** — 1,16.

Матар'ялы, якія друкаваліся ў «Зьвязьдзе», паказваюць, што ў галіне рацыянальнага скарыстаньня вагоннага парку ёсьць сур'ёзныя недахопы.

Рад чыгуначных арганізацый слаба вядуць барацьбу за павышэньне эфэктыўнасьці работы вагонаў.

На станцыі **Віцебск** прастої цыстэрнаў сыстэматычна даходзяць да 75 гадзін. На гэтай - жа станцыі паражным і гружаным вагоны прастойваюць па некалькі сутак без карысьці.

Спэцыялізацыя і маршрутызацыя— важнейшыя сродкі найбольш эфэктыўнага скарыстаньня вагонаў — ігнаруюцца. Асабліва дрэнна з маршрутызацыяй у **Аршанскім** раёне. Замест нормы 15 выканана 3,5.

Якасьць рамонту вагонаў усё яшчэ кульгае. Абменныя пункты ня сталі санраўднымі здраўпцамі вагоннага парку. Паўторнасьці рамонту — не адзінкавыя выпадкі. На радзе пунктаў абмяжоўваюцца толькі фіксацыяй дэфэктаў і не змагаюцца за ліквідацыю іх.

На **Жлобінскім** рамонтным пункце вагоны прастойваюць, чакаючы рамонту больш часу чым у самым рамонце.



Паравоз № С.-272 ст. Гомель—ўдзельнік усесаюзнага конкурсу.

Значныя прастої вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай. Кліентура несваячасова выкупляе грузы. Адміністрацыя станцый ня прымае рашучых мер да разгрузкі таварных двароў. Наглядаюцца сустрэчныя перавозкі (**Лепель**), якія прыводзяць да непрадукцыйных страт. Ёсьць таксама значныя недагрузкі цягнікоў на станцыі **Гомель.**

Камэрцыйная хуткасьць цягнікоў— адна з асноўных умоў павялічэньня звароту вагонаў і паравозаў. Трэба сказаць, што ў гэтым пытаньні ў сакавіку дасягнуты пэўныя посьпехі. Ва ўсіх раёнах, апрача **Аршанскага,** выкананы і перавыкананы нормы. Гэтыя посьпехі трэба замацаваць, а Аршанскаму раёну, які наогул ідзе наперадзе па скарыстаньні вагоннага парку, неабходна і па гэтым вучастку падцягнуцца.

Загад тав. Андрэева абавязвае зьпіншыць рух цягнікоў у адным кірунку неарганізавана — пачкамі. Між тым, па радзе вузлоў **(Віцебск, Жлобін)** гэты загад ня выконваецца. Трэба рэгуляваць рух цягнікоў у адным напрамку з тым, каб яны не стваралі пробак, каб яны спрыялі найбольш эфэктыўнай рабоце распарадчых станцый.

Прычына замарожваньня звароту вагонаў хаваецца раней за ўсё ў дрэнным рабоце тэхнічных станцый і дэпо, у слабай усё яшчэ працоўнай дысцыпліне. Падача паравозаў пад манэўровыя апэрацыі, дрэнная арганізацыя манэўраў і г. д. прыводзяць да прастояў вагонаў на распарадчых станцыях. З гэтым трэба пакончыць. Барацьба за палепшэньне эксплёатацыйнай работы чыгунак павінна быць узьнята партарганізацыяй на адпаведную вышыню.

Трэба поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх зьвеньнях станцыйнай гаспадаркі, дабіцца пляновасьці ў рабоце, рашуча палепшыць арганізацыю пагрузачна - разгрузачных работ, да мінімуму скараціўшы прастої вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай. Трэба прымусіць кліентуру акуратна выконваць свае абавязкі ў гэтай справе. Адначасова неабходна ўзгадняць з адпраўцелямі і атрымацелямі час падачы вагонаў пад пагрузку і выгрузку. Таварныя двары павінны працаваць круглыя сутки. Павышэньне кваліфікацыі дыспэтчарскага апарату, узмацненьне працоўнай дысцыпліны зьяўляюцца таксама важнейшымі ўмовамі павялічэньня звароту вагонаў.

На - бальшавіцку змагаючыся за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, за павышэньне эфэктыўнай работы паравозаў і вагонаў, забясьпечым выкананьне пляну перавозак чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Р. Д.

Упарадачыць пагрузачна-разгрузачныя работы

ВІЦЕБСК. (Ад наш. спэцкора). Флёт Віцебскай прыстані выступіў у першае плаваньне.

Трансфінпляц распрацован і даведзен да кожнага судна. Камандзе параходу «Валката» высунула сутрэчны: павялічыць загрузку на адну індэкатарную сілу ўверх на 0,03 тоны і ўніз—на 0,13 тоны, скараціць прастой ў часе набору апалу за 1 абарот на 25 мін. і г. д. Каманда параходу «Таропа», таксама павялічыла сваё вытворчае заданьне на 5 проц. На лепшае выкананьне трансфінпляну паміж камандамі заключаны сацдагавары.

Усе судны пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Устаноўлены нормы выдаткаваньня апалу, змазкі і хадавога часу. Значная работа праведзена па зьнішчэньні «ляпацкай» ураўнілаўкі ў зарплаце. Заработак камскладу і каманды ўстаноўлен, выходзячы з магутнасьці судна і адпаведна кваліфікацыі.

Для пагрузачна-разгрузачных работ транспарт рабсілай забясьпечан. Горш справа з мэханізацыяй пагрузачна-разгрузачных работ. За выключэньнем перавалачнага пункту ў Чэпіна, дзе зараз ідзе пабудова 3-га брэнзбэргу, уся работа па пагрузцы і выгрузцы на прыстанях робіцца ўручную.

Водная кааперацыя правяла падрыхтоўку да абслугоўваньня воднікаў у плаваньні. На пасажырскіх параходах арганізаваны буфэты. Усе буксірныя судны забясьпечаны грамадзкім харчаваньнем. На ўсіх галоўных прыстанях ёсьць ларкі з прадуктамі. Зараз заканчваецца пабудова плавучай крамы для абслугоўваньня сплаўскладу.

Праверка работы сталоўкі паказала зусім добрую якасьць абедаў, але памяшканьне сталоўкі малое, з-за чаго бываюць чаргі. Кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага рэчнага транспарту ўсё яшчэ затрымлівае выдачу грошай на пабудову новай сталоўкі, праект якой зацьверджан і ўжо часткова падрыхтован матар'ял. Жылым памяшканьнем (інтэрнатам і чакалкамі) грузчыкі таксама забясьпечаны. Горш справа з спэцвопраткай і пасьцельнымі прыладамі. (забясьпечана толькі на 50 проц.).

Уведзеная дыспэтчарская сыстэма зрываецца з-за адсутнасьці тэлефоннай сувязі, пабудова якой затрымліваецца кіраўніцтвам ДДРТ. Наогул трэба адзначыць зусім слабую дапамогу кіраўніцтва ДДРТ.

Арк. Зарубежны.

Яшчэ аб другой пяцігодцы хэмічнай прамысловасьці БССР*)

XVII усесаюзная партыйная канфэрэнцыя ў сваіх дырэктывах аб складаньні пляну другой пяцігодкі прапанавала: **«Па хэмічнай прамысловасьці цалкам ліквідаваць адставаньне ад тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі ў цэлым».** Гэта адставаньне хэмічнай прамысловасьці ў першую чаргу пагражае падвядзеньню базы пад уздым ураджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Гэтыя дырэктывы павінны служыць асновай складаньня другой пяцігодкі хэмічнай прамысловасьці БССР.

Тав. **Дабравольскі** ў сваім артыкуле «Хэмічная прамысловасьць БССР у другой пяцігодцы» (гл. «Зьвязду» ад 11 сакавіка) даў першыя арыентовачныя намячэньні разгортваньня хэмічнай індустрыі ў другой пяцігодцы. У артыкуле паказан вялікі размах хэмічнай прамысловасьці БССР, як па капітальных укладаньнях, так і па росту валавой прадукцыі і ліку занятых рабочых. У аснову разгортваньня хэмічнай прамысловасьці пакладзена так званая «прапойская праблема» (пабудова прапойскага камбінату). БССР, паводле намячэньняў другой пяцігодкі, павінна пабыць выразны «хэмічны» твар. Але дасканалае вывучэньне зьмешчаных матар'ялаў гаворыць аб тым, што ў іх далёка ня поўнасьцю ахоплены асноўныя пытаньні хэмічнай прамысловасьці. У гэтых матар'ялах ня вызначана, напрыклад, месца мясцовай прамысловасьці і прамысловай кааперацыі. Гэтыя галіны вытворчасьці павінны ў значнай ступені дапоўніць дзяржаўную хэмічную прамысловасьць.

У артыкуле тав. Дабравольскага няма нават намёку на ўвязку хэмічнай прамысловасьці з лесахэміяй. Між тым, у другой пяцігодцы мы павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на разгортваньне лесахэміі, па рацыянальнае выкарыстоўваньне нашых лясных багацьцяў.

Хэмаб'яднаньне невыстарчальна распрацавала так званую «прапойскую» праблему. Эканамічнае абгрунтаваньне яе прыцягнута «за вушы». Хэмаб'яднаньне праблему пабудовы прапойскага камбінату ўвязвае з газыфікацыяй торфу, скарыстаньнем бульбы і разгортваньнем серна-кіслотнай вытворчасьці, якая будзе напырацца на базе прывознага сырцу. Тут выпаў такі важны момант, як каксаваньне торфу.

Паводле намячэньняў хэмаб'яднаньня, вызначан выраб да 12 тыс. тон тарфяной сажы, якая пойдзе на выпрацоўку сынтэтычнага каучука. Па нашай думцы, у якасьці напаўніцеля пры вырабе каучука патрэбна не тарфяная, а **газавая** сажа. Таму гэта пытаньне яшчэ трэба прапрацаваць з боку тэхналёгіі.

На базе сынтэзу аміяка праектуецца выраб складанага ўгнаеньня: так званага «прэцыпінату», «амафосу». і інш. Гэта вытворчасьць патрабуе пабудовы заводу сернай кіслаты. Мы лічым, што пабудова такога заводу ў БССР немэтазгодна. «Гідрахэм» пры актыўным удзеле маладых спэцыялістаў дабіўся і практычна вырашыў праблему інтэнсіфікацыі існуючых серна-кіслотных установак, што дае ў тры разы больш эфэкт па колькасьці выпрацоўкі і ў 8-9 раз зьмяншае капіталаўкладаньні. Нельга складаць пляну, ня ўлічваючы апошніх дасягненьняў нашай хэмічнай тэхнікі. Серна-кіслотная вытворчасьць павінна ў далейшым ісьці не па шляху будаўніцтва новых заводаў, а ў асноўным па шляху інтэнсіфікацыі існуючых вежавых і кантактных заводаў.

*) У парадку прапаноў.

Асаблівую ўвагу, на нашай думцы, трэба зьвярнуць на **палепшэньне якасьці размолу** нашых родных фасфарытаў. Трэба ўлічваць, што ўмовы глебы вельмі спрыяючыя для пашырэньня ўжываньня фасфарытных угнаеньняў. Нашы фасфарыты параўнальна бедныя фосфарнай кіслатой і ня могуць сур'ёзна канкураваць з вяцкімі, якія маюць 24-28 проц. фосфарнай кіслаты і падольскімі, якія маюць 34-36 проц. Таму якасьць памолу набывае вялізарнае значэньне.

Другая пяцігодка хэмічнай прамысловасьці павінна ясна і выразна вызначыць колькасныя і якасныя паказальнікі ў галіне вапнаваньня глебы.

Вапнаваньне глебы, ня гледзячы на яго асаблівае значэньне для ўздыму ўраджайнасьці нашых палёў, укараняецца зусім слаба. Так, у 1928 годзе план вапнаваньня выкананы на 17 проц., у 1929-30 г. — на 20 проц., у 1931 г. — на 13 проц., у першым кварталё г. г. вывезена вапны 7,6 проц. заданьня. Тут ясна відна недацэнка вапнаваньня. Неабходна рашуча вызначыць, за што і ў якой меры адказвае тут хэмічная прамысловасьць і за што нясе адказнасьць Наркамзем.

«Вузкім» месцам праектовак другой пяцігодкі хэмічнай прамысловасьці зьяўляецца пытаньне аб **сапрапэлітах.**

Сапрапэліты ў БССР вывучаюцца злачынна марудна. Тэмпы работ навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці і «Белгеалёразьведкі» настолькі павольныя, што мы ня маем амаль ніякіх даных аб асаблівасьцях і хэмічных уласьцівасьцях нашых сапрапэлітаў. Гэту справу на працягу 1932 г. трэба рашуча штурхнуць наперад. Нельга забываць, што сапрапэліты могуць даць высока-каларыйны апал (бэнзін, газа), цяжкія маслы, смалу, асфальт і інш. Шляхам пэўнай хэмічнай апрацоўкі можна атрымаць лёгкалятучыя вуглеводароды, якія могуць быць скарыстаны для рухавікоў унутранога спаньваньня.

Пры далейшай апрацоўцы сапрапелі даюць высока-каштоўны ізаляцыйны матар'ял, сынтэтычны каучук, розныя віды сьпіртаў, фанолы і інш.

На базе скарыстаньня торфу і хэмічнай апрацоўкі драўніны ёсьць поўная магчымасьць запраектаваць стварэньне дадатковай кармовай базы. Тэхналёгічны працэс гідролізу торфу, праведзены нашым дасьледчым інстытутам, паказаў, што з торфу можна атрымаць вельмі танны і добраякасны кармовы цукар.

На аснове пераапрацоўкі вапны трэба пашырыць вытворчасьць ацэтылена, карбід-кальцыя й інш.

Як мы бачым, перад хэмічнай прамысловасьцю БССР стаяць самыя вялізарныя перспэктывы.

Трэба пяцігодку хэміі шырока абгаварыць сярод рабочай грамадзкасьці. Неабходна, каб арганізацыі Асоавіяхіму забясьпечылі шырокае абмеркаваньне яе сярод членаў Асоавіяхіму.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б, аб асноўных установках да складаньня пляну другой пяцігодкі прапануе забясьпечыць максымальнае разгортваньне ў БССР торфахэміі, лесахэміі, тутавай прамысловасьці, лякафарбовачнай вытворчасьці, вытворчасьці пластычных мас, скарыстаньне сапрапэлевых пакладаў і г. д. Гэта пастанова павінна зьявіцца баявой праграмай бальшавіцкай барацьбы за хэмізацыю народнай гаспадаркі БССР.

Інж. АВЕР'ЯНАЎ.

ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧЫХ БРЫГАД—АСНОВА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР аб выкананьні дырэктыў па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад

1. Адзначыць зусім незадавальняючы ход работы па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах. Пастановы ЦК КП(б)Б, НКЗБ і Калгасцэнтру БССР аб скарэньні работы па арганізацыі брыгад ва ўсіх калгасах да 1 красавіка 1932 г. ня выкананы.

2. На 15 красавіка г. г., паводле вестак 68 раёнаў, у 4263 калгасах арганізавана 10.200 пастаянных вытворчых брыгад, што складае 49,3 проц. ад агульнага ліку калгасаў гэтых раёнаў.

Толькі 6 раёнаў набліжаюцца да скарэньня арганізацыі брыгад— Вузьдзенскі—92,9 проц., Заслаўскі—84,4 проц., Смалявіцкі—80,8 проц., Старобінскі—95,9 проц., Віцебскі—88,6 проц. і Чырвона-Слабодзкі—95 проц.

Ня здолелі арганізаваць работу па выкананьні дырэктыў ЦК КП(б)Б і Калгасцэнтру БССР па арганізацыі брыгад раёны: Талачынскі, у якім арганізаваны пастаянныя брыгады ў 6,6 проц. калгасаў, Бешанковіцкі—ў 12,8 проц., Расонскі—ў 15,8 проц. і Лоёўскі—ў 17,4 проц.

7. раёнаў: Дуброўенскі, Сіроцінскі, Чашніцкі, Койданаўскі, Жыткавіцкі, Парыцкі і Рэчыцкі да гэтага часу не даслалі вестак аб ходзе работы па арганізацыі пастаянных брыгад.

3. Калі рад перадавых калгасаў паказалі ўзорныя прыклады арганізацыі брыгад (камуна «Прагрэс», Лёзьнянскага раёну, калгас «1 мая», Койданаўскага раёну, калгас «Чырвоная Беларусь», Аршанскага раёну, калгас «Сейбіт», Пятрыкоўскага раёну і інш.), рад калгасаў у практычнай рабоце па арганізацыі пастаянных брыгад дапусьцілі рад буйнейшых памылак і скажэньняў у гэтым пытаньні.

У многіх калгасах арганізацыя пастаянных брыгад ня ўвязваецца, са складаньнем вытворча - фінансавых пляноў, пры разьмяшчэньні культур ня ўлічваецца ўвядзеньне севазвароту, адкавядаючых спэцыялізаванаму напрамку гаспадаркі, маюць месца мэханічнае разьмеркаваньне культур па ўсіх вытворчых вучастках і мэханічнае разьмеркаваньне людзей на брыгадах. Наглядаецца рад фактаў арганізацыі брыгад па былых аддзяленьнях, бяз уліку разьмераў зямельных вучасткаў і падбору культур па іх, што фактычна захоўвае форму брыгады-дворкі, арганізуюцца пастаянныя брыгады ў дробных калгасах, маючых 10-15 гаспадарак. Невыстарчальная ўвага аддаецца падбору брыгадзіраў і арганізацыі калгаснага актыву.

4. Адсутнасьць належнай работы па арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад і дапушчэньне скажэньняў і памылак, праўленьне Калгасцэнтру расцэньвае, як апартуністычную недацэнку з боку раду калгасаў і праўленьняў калгасаў таго вялізарнейшага значэньня, якое адыгрываюць пастаянныя вытворчыя брыгады ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і забясьпячэньні пасьпяховага праведзеньня сяўбы і ўборкі.

Праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляе:

1) Прапанаваць усім калгассаюзам дабіцца рашучага пералому ў справе арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад, забясьпечыўшы скарэньне гэтай работы ў бліжэйшыя дні.

Арганізацыя пастаянных брыгад павінна зьяўляцца неадрыўнай часткай складаньня вытворча-фінансавых пляноў. Пазрасьлінаючы ацабленьне работы ў складаньні вытворча-фінансавых пляноў, праўленьне Калгасцэнтру абавязвае праўленьні калгасаўзаў і калгасаў забясьпечыць, каб у кожным калгасе да пачатку палявых работ быў складзен і абгаворан вытворча-фінансавы план і на аснове яго распрацаваны і выданы брыгадзірам гадавыя вытворчыя заданьні і рабочыя пляны-нарады па веснавую сяўбу.

У тых калгасах, дзе па розных умовах немагчыма забясьпечыць складаньня вытворча-фінансавага пляну па спэцыялізаванай форме, прыстасаваць форму скарочанага вытворча-фінансавага пляну для неспэцыялізаваных калгасаў.

2) Адмяніць планы арганізацыі пастаянных брыгад у калгасах, якія дапусьцілі скажэньні:

а) калгасу «Чырвоны камунар», Плешчаніцкага раёну, які мэханічна разьмясьціў усе культуры на зямельных вучастках ранейшых аддзяленьняў бяз увяжкі са севазваротам (пры агульнай плошчы яравога пасеву ў 18 га пасеў 25,9 га яменно разьмешчан на вучастку першай брыгады—8,7 га, на вучастку 2-й брыгады—9 га, на вучастку 3-яй брыгады—4,6 га, на вучастку 4-й брыгады—3,6 га; пасеў 10 га ільну разьмешчан на вучастку першай брыгады—3,5 гэкт., на вучастку другой брыгады—3,4 гэкт., на вучастку 3-й брыгады—2,7 гэкт., на вучастку 4-й брыгады—1,4 гэкт. Для ўборкі сенажацяй намечана стварыць «каротка-тэрміновыя» брыгады са складу астатніх пастаянных брыгад;

б) калгасу «Чырвоны баец», Барысаўскага раёну, які намецёў арганізаваць для ўборкі азімых зборную брыгаду з усіх брыгад калгасу;

в) калгасу «Камбайн», Слуцкага раёну, які разьбіў пораўну ўсіх людзей на тры брыгады па 40 чалавек, насьля чаго падбіраў зямельныя вучасткі для брыгад;

г) калгасу імя Леніна, Слуцкага раёну, які арганізаваў брыгады «па вуліцах» ўлёнай формы брыгад-дворак.

Прапанаваць калгассаюзам гэтых раёнаў накіраваць работнікаў апарату ў гэтыя калгасы для выпраўленьня дапушчаных скажэньняў.

3) Прапанаваць Жлобінскаму калгассаюзу перагледзіць планы арганізацыі брыгад у калгасе «Расьсьвет пераможца», у якім з трох арганізаваных брыгад адна брыгада арганізавана па зямельным вучастку ў 502 гэктары з 15 культурамі, з пастаянным складам людзей у брыгадзе ў 85 чалавек у бок арганізацыі па гэтым вучастку 2-3 [illegible]

пасьпяховае выкананьне пляну перавозак ад ўсёй сур'ёзнасьцю высоўнае пытаньне аб найбольш эфэктыўным скарыстаньні рухомага саставу. У гэтым годзе ўваходзяць у эксплёатацыю новыя 1.300 паравозаў і 50.000 вагонаў. Пытаньне аб найбольш рацыянальным скарыстаньні рухомага саставу мае выключна важнае значэньне.

Важнейшай умовай выкананьня пляну перавозак зьяўляецца **«барацьба за беражлівае скарыстаньне транспартных сродкаў вагонаў і паравозаў, скарачэньне ўсякіх прастояў пад пагрузкай і выгрузкай»** (з пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б)).

У даным артыкуле мы маем на ўвазе больш падрабязна спыніцца на пытаньні вагоннай гаспадаркі. Задачы сваячасовага прасоўваньня вясенавых грузаў, будматар'ялаў, задачы асенньга-зімовых перавозак патрабуюць падняцьця якасьці работы вагоннага парку. А між тым, у гэтай частцы ёсьць рад недахопаў.

Возьмем пытаньне звароту вагонаў. Тут ёсьць значнае адставаньне. Толькі адзін **Аршанскі** раён ідзе наперадзе. Ён у сакавіку выканаў норму звароту вагонаў ў суткі на 103,8 проц. Астатнія раёны ня выканалі нормы: **Жлобінскі**—на 25,88 проц. **Гомельскі**—на 10,7 проц.

Аршанскі раён ідзе наперадзе і па выкананьні нормы сярэдня - сутачнага прабегу таварнага вагона (109,2 проц.) і па колькасьці гадзін карыснай работы таварнага вагона ў суткі (0,37 гадзіны перавыкананьня нормы). **Жлобінскі** раён недавыканаў норму сярэдня - сутачнага прабегу таварнага вагона на 20,89 проц., **Гомельскі** — на 7,1 проц., **Віцебскі** — 9,1 проц. Па колькасьці гадзін работы таварнага вагона ў суткі **Жлобінскі** раён недавыканаў норму на 1,74, **Гомельскі** — на 0,63, **Віцебскі** — 1,16.

Матар'ялы, якія друкаваліся ў «Зьвязьдзе», паказваюць, што ў галіне рацыянальнага скарыстаньня вагоннага парку ёсьць сур'ёзныя недахопы.

Рад чыгуначных арганізацый слаба вядуць барацьбу за павышэньне эфэктыўнасьці работы вагонаў.

На станцыі **Віцебск** прастої цыстэрнаў сыстэматычна даходзяць да 75 гадзін. На гэтай - жа станцыі паражным і гружаным вагоны прастойваюць па некалькі сутак без карысьці.

Спэцыялізацыя і маршрутызацыя— важнейшыя сродкі найбольш эфэктыўнага скарыстаньня вагонаў — ігнаруюцца. Асабліва дрэнна з маршрутызацыяй у **Аршанскім** раёне. Замест нормы 15 выканана 3,5.

Якасьць рамонту вагонаў усё яшчэ кульгае. Абменныя пункты ня сталі санраўднымі здраўпцамі вагоннага парку. Паўторнасьці рамонту — не адзінкавыя выпадкі. На радзе пунктаў абмяжоўваюцца толькі фіксацыяй дэфэктаў і не змагаюцца за ліквідацыю іх.

На **Жлобінскім** рамонтным пункце вагоны прастойваюць, чакаючы рамонту больш часу чым у самым рамонце.

Паравоз № С.-272 ст. Гомель—ўдзельнік усесаюзнага конкурсу.

Значныя прастої вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай. Кліентура несваячасова выкупляе грузы. Адміністрацыя станцый ня прымае рашучых мер да разгрузкі таварных двароў. Наглядаюцца сустрэчныя перавозкі (**Лепель**), якія прыводзяць да непрадукцыйных страт. Ёсьць таксама значныя недагрузкі цягнікоў на станцыі **Гомель.**

Камэрцыйная хуткасьць цягнікоў— адна з асноўных умоў павялічэньня звароту вагонаў і паравозаў. Трэба сказаць, што ў гэтым пытаньні ў сакавіку дасягнуты пэўныя посьпехі. Ва ўсіх раёнах, апрача **Аршанскага,** выкананы і перавыкананы нормы. Гэтыя посьпехі трэба замацаваць, а Аршанскаму раёну, які наогул ідзе наперадзе па скарыстаньні вагоннага парку, неабходна і па гэтым вучастку падцягнуцца.

Загад тав. Андрэева абавязвае зьпіншыць рух цягнікоў у адным кірунку неарганізавана — пачкамі. Між тым, па радзе вузлоў **(Віцебск, Жлобін)** гэты загад ня выконваецца. Трэба рэгуляваць рух цягнікоў у адным напрамку з тым, каб яны не стваралі пробак, каб яны спрыялі найбольш эфэктыўнай рабоце распарадчых станцый.

Прычына замарожваньня звароту вагонаў хаваецца раней за ўсё ў дрэнным рабоце тэхнічных станцый і дэпо, у слабай усё яшчэ працоўнай дысцыпліне. Падача паравозаў пад манэўровыя апэрацыі, дрэнная арганізацыя манэўраў і г. д. прыводзяць да прастояў вагонаў на распарадчых станцыях. З гэтым трэба пакончыць. Барацьба за палепшэньне эксплёатацыйнай работы чыгунак павінна быць узьнята партарганізацыяй на адпаведную вышыню.

Трэба поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх зьвеньнях станцыйнай гаспадаркі, дабіцца пляновасьці ў рабоце, рашуча палепшыць арганізацыю пагрузачна - разгрузачных работ, да мінімуму скараціўшы прастої вагонаў пад пагрузкай і выгрузкай. Трэба прымусіць кліентуру акуратна выконваць свае абавязкі ў гэтай справе. Адначасова неабходна ўзгадняць з адпраўцелямі і атрымацелямі час падачы вагонаў пад пагрузку і выгрузку. Таварныя двары павінны працаваць круглыя сутки. Павышэньне кваліфікацыі дыспэтчарскага апарату, узмацненьне працоўнай дысцыпліны зьяўляюцца таксама важнейшымі ўмовамі павялічэньня звароту вагонаў.

На - бальшавіцку змагаючыся за рэалізацыю шасьці ўмоў тав. Сталіна, за павышэньне эфэктыўнай работы паравозаў і вагонаў, забясьпечым выкананьне пляну перавозак чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Р. Д.

Упарадачыць пагрузачна-разгрузачныя работы

ВІЦЕБСК. (Ад наш. спэцкора). Флёт Віцебскай прыстані выступіў у першае плаваньне.

Трансфінпляц распрацован і даведзен да кожнага судна. Камандзе параходу «Валката» высунула сутрэчны: павялічыць загрузку на адну індэкатарную сілу ўверх на 0,03 тоны і ўніз—на 0,13 тоны, скараціць прастой ў часе набору апалу за 1 абарот на 25 мін. і г. д. Каманда параходу «Таропа», таксама павял

Гаспадары Францыі і яе замежнай палітыкі

ПАРЫЖ. Заводы і фабрыкі Францыі, Чэха-Славакіі, Польшчы, Румыніі, Югаславіі і нават Аўстрыі і Вэнгрыі працуюць з поўнай нагрузкай для ўзбраення японскай арміі. Вялізарныя параходы вязуць гэтае ўзбраеньне на Далёкі Ўсход. Гарматныя, ружэйныя і хэмічныя заводы набіраюць новых рабочых, ня гледзячы на крызіс, які лютуе на копа. Хто пакрывае ўсе гэтыя выдаткі? Японскае казначэйства знаходзіцца далёка ня ў квітнеючым стане і без замежных крэдытаў яно наўрад ці ў стане было-б справіцца з аплатай сваіх ваенных заказаў.

Павінна існаваць, значыць нейкая арганізацыя, якая субсыдавала-б японскі захват Манчжурыі і вялізарныя ўзбраеньні Японіі, якія прызначаны, зразумела, зусім не для барацьбы супроць кітайскіх армій.

Ужо амаль не зьяўлясецца сакрэтам, што такая арганізацыя сапраўды існуе і мае свайм месцазнаходжаньнем Францыю. Называецца яна банкам «Юніён-Парызьен» галоўным кіраўніком якога зьяўляецца ЭЖЭН ШНЭЙДЭР, ГАРМАТНЫ КАРОЛЬ, кіраўнік вядомай фірмы «Крэзо». Пад кіраўніцтвам «Юніён Парызьен» працуе фінансава-прамысловы канцэрн «Юніён Эропэен энДустрыель э фінансьер», старшынёй якога таксама зьяўляецца той-жа Шнэйдэр. Да канцэрну далучаецца банк «Крэдзі Онгруа» («Вэнгерскі крэдыт»).

Гэта група прамысловых і фінансавых прадпрыемстваў была заснавана ў 1920 г., калі францускі капітал прыступіў да скарыстаньня плёнаў сваёй перамогі над Германіяй.

Банк «Юніён Парызьен» па пачыне Шнэйдэра стварыў «Юніён Эропэен», прычым у ролі заскавальнікаў і пайшчыкаў у новы канцэрн уступілі капіталісты парыскіх банкаў, а таксама буйнейшая мэтапюргічная фірма, Францыя Вэндэль і К і таварыства Шнэйдэр і К (Крэзо). У сучасны момант «Юніён Эропэен» кантралюе і ўладае акцыямі дзесяткаў прамысловых прадпрыемстваў у краінах, зьвязаных палітычнымі сувязямі з Францыяй, а іменна ў Чэха-Славакіі, у Польшчы, Аўстрыі, Люксэмбургу, Вэнгрыі, Югаславіі, Баўгарыі, Румыніі.

Такім чынам, невялікая кучка капіталістаў, якая трымае ў сваіх руках золата, крэдыт і вагары прамысловасьці, у радзе эўрапэйскіх краін, фактычна пануе ў палітыцы гэтых краін, накіроўвае ў сваіх інтарэсах работу «вялікай» прэсы, дыктуе сваю волю ўрадам. Група Шнэйдэра зацікаўлена цяпер у разьдымухваньні далёка-ўсходняга канфлікту і ў атрыманьні вялізарных заказаў на ўзбраеньні. ЯНА СНАБЖАЕ ЯПОНІЮ КРЭДЫТАМІ І НА ГЭТЫЯ-Ж КРЭДЫТЫ ВЫПУСКАЕ ДЛЯ ЯЕ ЗБРОЮ. Гэта група загадзя улічвае міліярдныя прыбыткі ў выпадку пашырэньня сфэры ваенных дзеяньняў і па меры сіл стараецца ўцягнуць у сутычку эўрапэйскіх саюзнікаў Францыі, якія зьяўляюцца пастаяннымі кліентамі заводаў Шнэйдэраўскага канцэрну. ЗАМЕЖНАЯ ПАЛІТЫКА ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ — ГЭТА ІНТАРЭСЫ ШНЭЙДЭРА І К° («Кр. Зв.»).

Новая польска-румынская ваенная згода

Пілсудзкі—галоўнакамандуючы саюзных армій

БЭРЛІН, 23. Як паведамляе агенцтва Юнайтэд прэс з Добра сьвядомых варшаўскіх крыніц, Пілсудзкі ў часе свайго знаходжаньня ў Бухарэсьце заключыў з Каролем і з румынскім урадам дадатковую згоду да польска-румынскага Дагавору аб ваенным саюзе. Паводле гэтай згоды, У ВЫПАДКУ ВАЙНЫ ПІЛСУДЗКІ БУДЗЕ НАЗНАЧАН ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫМ АБ'ЯДНАНЫХ ПОЛЬСКА-РУМЫНСКІХ АРМІЙ.

Вывучэньне пляцдарму будучага наступленьня

БЭРЛІН, 23. Варшаўскі карэспандэнт «Кельнішэ Цэйтунг» піша: «Пілсудзкі ў часе свайго знаходжаньня ў Эгіпце заўсёды займаўся ваеннымі навукамі і праблемамі апэрацыйнай тактыкі і стратэгіі. У прыватнасьці, Пілсудзкі вывучаў ваенна-палітычныя пытаньні савецка-польскай вайны 1920 г., што зьяўляецца яго ваенна-тэарытычным каньком. Гэтыя праблемы і зараз не пазбаўлены актуальнасьці і ў гэтым сэнсе трэба вытлумачыць таксама паездку Пілсудзкага ў Бэсарабію, дзе вядзецца актыўная ваенная падрыхтоўка супроць Савецкага Саюзу».

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Новыя катаржныя прысуды

ВІЛЬНЯ, 19. У сувязі з наближэньнем 1-га мая ў Заходняй Беларусі спэцыяльнасьці свалтасабліваю «ажыўленьне» дзейнасьці судоў. За апошнія дні адбыўся рад палітычных працэсаў. Значная колькасьць рабочых і сялян пайшла на розныя тэрміны за краты.

Так, у БАРАНАВІЧАХ выязная сэсія Навагрудзкага акруговага суда разглядала справу сялян Стаўпецкага павету: Александра Герасімчыка, Антона Кіселя, Міхася Кіселя, Ільлі Шута і Александра Шута. Усіх іх абвінавачалі па «славутаму» 102 артыкулу карнага кодэксу — у прыналежнасьці да КПЗБ і ў імкненьні «скінуць цяперашні дзяржаўны лад». Герасімчык засуджаны на 5 год катаргі, рэшта — на 4 гады кожны.

Аналёгічны працэс адбыўся ў Віленскім акруговым судзе. Падсудным — сялянін з вакольц Докшыц: Рыгор Маскалёнак, Ян Бураковіч, Зьмітро Васюкевіч — Дзямідовіч, браты Васіль і Міхалай Рунічы, Пётра і Тодар Данілавічы, а таксама Ўладзімер Пётра і Тодар Малужанцы. На лаве абвінавачаных знаходзіліся ўсе, за выключэньнем Пётры Данілавіча і Рыгора Маскалёнка, якіх паліцыя не ўдалося арыштаваць.

Акт абвінавачваньня гаварыў аб «камуністычнай дзейнасьці» падсудных сялян, якая заключалася ў агітацыі за байкот падаткаў. Суд прыгаварыў Васіля Руніча на 5 год катаргі, Пётру Данілавіча — на 4 гады, і Ўладзімера Малужанца — на 3 гады. Рэшта падсудных з прычыны абсалюткай адсутнасьці довадаў віны — апраўданы.

Аналёгічны працэс адбыўся ў Віленскага Адзінства»: т. т. Сьцяпан Сьніт чак—рабочы-муляр з Лодзі і Яніна Ігнасяк—з Варшавы.

Тав. Яніна Ігнасяк будзе першай жанчынай-кандэпутаткай у польскім сойме.

Два новыя кам дэпутаты ў польскім сойме

ВАРШАВА, 21. Як вядома, польскі сойм выдаў у свой час суду камуністычных паслоў т. т. Букынскага і Данецкага.

На іх месца ў сойм увайшлі два наступныя кандыдаты Рабоча-Сялянскага Адзінства»: т. т. Сьцяпан Сьніт чак—рабочы-муляр з Лодзі і Яніна Ігнасяк—з Варшавы.

Тав. Яніна Ігнасяк будзе першай жанчынай-кандэпутаткай у польскім сойме.

Папярэднія вынікі выбараў у прускі ландтаг

БЭРЛІН, 24. Вынікі галасаваньня прадстаўляюцца ў наступным выглядзе: камуністы атрымалі 1.481.000 (30 мандатаў), сацыял-дэмакраты атрымалі 2.069.000 (41 мандат), нацыянал-сацыялісты — 735.000 (14 мандатаў), партыя цэнтру 2.147.000 (43 мандаты), народная партыя — 198.000 (3 мандаты), дэмакратычная партыя—153.000, нацыянал-сацыялісты (фашысты) — 3.675.000 (76 мандатаў), крысціянскія сацыялісты — 129.000 (2 мандаты), гаспадарчая партыя—127.000 (2 мандаты).

Нота Данцыгу Польшчы

БЭРЛІН, 22. Згодна паведамленьня германскага друку данцыгскі сэнат перадаў ноту польскаму дыпляматычнаму представіцелю ў Данцыгу Паппе. Нота зьмяшчае пратэст супроць ніякіх вымыслаў, якія распаўсюджваюцца ўсім польским друкам аб унутрыпалітычным становішчы Данцыгу. Дэн цыгскі сэнат просіць представіцеля Польшчы асабіста абвергнуць пяцпадільнае паведамленьне «Дэсэнлікга Быдгескага», быццам Паппе пратэставаў супроць уезду гітлераўскіх афіцэраў у Данцыг.

Падрыхтоўка да 1-га мая

ЦК КП(б)Б, ГАЗЭЦЕ „ЗЬВЯЗДА"

БАБРУЙСК, 25. (Па тэлеграфу).

Загад партыі і ўраду аб суцэльнай пісьменнасьці на Бабруйскім камбінаце выканан. Камбінат ператвораны у суцэльна-пісьменнае прадпрыемства.

Партком РАБКІН.
Дырэктар камбінату ТАРАСАЎ.
Заўком СЬВЯРДЛАНСКІ.
Рэдакцыя газэты «ЗА ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ».

Эканомія ў 1800 руб. золатам

Рабочыя менскай электрастанцыі абвясьцілі красавік, месяц, месяцам штурму па выкананьні прамфінпляну. Лепшыя брыгады і цэхі ў часе першамайскіх сьвят будуць прэміраваны. На прадпрыемстве разгортваецца шырокае спаборніцтва за пераходны сьцяг.

Для таго, каб атрымаць пераходны сьцяг неабходна: выканаць прамфінпляны як па якасных, так і колькасных паказальніках, зьнізіць да мінімуму брак, ліквідаваць паломкі, прагулы і спазьненьні на работу, ахапіць усіх рабочых сацыялістычным спаборніцтвам, забясьпечыць лепшы догляд за машынамі.

Адной з цэнтральных умоў для атрыманьня пераходнага сьцягу пастаўлена задача максымальнай эканоміі палівы і своечасовай дастаўкі яго ў кацельны цэх.

У першыя дні разгорнутага спаборніцтва кацельная брыгада дабілася значных посьпехаў па эканоміі палівы, па догляду за машынамі. Брыгада па прамыўцы катлоў пры выкарыстаньні ўсіх магчымасьцяй скарацілa прамыўку катла з двух тыдняў да 5 дзён.

Рацэй работа на ўстаноўцы выключацеляў выконвалася замежнымі інжынэрамі. Зараз рабочыя электрацэху ўстанавілі сваімі сіламі выключацель, чым в'эканомілі дзяржаве 1.800 руб. золатам.

Для арганізацыі і правядзеньня весняной сяўбы рабочыя электрастанцыі ў падпофны калгас накіравалі спэцыяльную брыгаду. Паміж калгасам «Вішнёўка» і рабочымі Эльводу заключан сацдагавор, які прадугледжвае перавыкананьне рабочымі свайго прамфінпляну і датэрміновае скончаньне калгаснікамі весняной сяўбы.

У часе першамайскіх сьвят на Эльводзе адбудзецца вынэск 20 шофэраў, якія праз спэцыяльныя курсы падрыхтаваны з рабочых электрастанцыі.

Гэтымі днямі 5 лепшых рабочых ударнікаў падалі калектыўную заяву аб прыёме іх у ленінскую партыю.

Лепшым настаўнікам-ударнікам—прэміі

РАГАЧОЎ. Перадавыя сельсаветы падыходзяць да 1 мая з буйнымі перамогамі па фронце барацьбы за суцэльную пісьменнасьць. Так, у Доеўскім сельсавеце 210 чалавек пісьменных гэтымі днямі заканчваюць працацоўку праграмы і атрымліваюць пасьведчаньні аб ліквідацыі сваёй пісьменнасьці.

Такія-ж посьпехі заваяваў і Зазенцкі сельсавет.

У барацьбе за суцэльную пісьменнасьць БССР на працягу ўсяго году гераічна змагаліся настаўнікі т. т. Мінчукоў, Відасёў і Ігнатоўскі, на вучастках якіх не засталося ніводнага пісьменнага. Памянёныя таварышы і цэлы рад другіх настаўнікаў за ўдарную актыўную работу прэміюцца раённымі арганізацыямі.

Літаратура аб 1 маі

1. Ленін — 1 мая (артыкулы і заметкі на расійскай мове);
2. Ленін і 1 мая (зборнік);
3. 1 мая — матар'ялы для дакладчыкаў, мэтадычная распрацоўка ЦК УсесКП(б), «Партвыдавецтво ЦК».
4. «Спутник агитатора для города», прысьвечаны 1 маю (№ 9, 1932 г.).
5. 1 мая — міжнароднае сьвята пралетарыяту (на яўрэйскай мове).

СУСЬВЕТНА - ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС І ПАДРЫХТОЎКА ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР

6. Бах. М. — Сусьветны эканамічны крызіс і рэвалюцыйны ўздым да 1 мая 1932 году, «Пролетиздат», 1932 г.
7. Зборнік у дапамогу раёну — Крызіс капіталізму, пагроза новых войн і інтэрвэнцыі. «Партиздат ЦК», 1932 г.
8. Вольскі — Як жыве і змагаецца польскі рабочы, «Партиздат ЦК» 1932 году.
9. Бандарэнка—СССР — ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту. Парт. выд. ЦК.

Літвінаў — Народы чакаюць разбраеньня (прамова па жэлэўскай канфэрэнцыі), ДВБ, 1932 год.

10. Жданаў М. — Японскі імпэрыялізм у Манчжурыі. 1932 г.

ЯК ВЯЛАСЯ АНТЫВАЕННАЯ БАРАЦЬБА Ў 1920 ГОДЗЕ І ЯК ВЕСЬЦІ ЯЕ ЦЯПЕР?

11. Райманд Б. — Жыцьцё і змаганьне амэрыканскага пралетарыяту. «Камінтэрн», 1932 г., № 20, ДВБ, 1932 год.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА І НАШЫ ЗАДАЧЫ

13. XVII партканфэрэнцыя (рэзалюцыі).
14. XVII партканфэрэнцыя ў пытаньнях і адказах. 1932 год.
15. Рэзалюцыі XIV зьезду КП(б)Б.
16. Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб весняной с.-г. кампаніі 1932 году. ДВБ, 1932 г.
17. Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало на сходзе менскага партактыву.

УВАГА: У бібліятэцы ёсьць сыпіс мастацкай літаратуры аб 1 маі, 42 маёўкі і зьмест маёвак кожнага году.

Бібліятэка дому Камасьветы.

Паведамленьні

— Менгаркомам КП(б)В ніжэйпамянёныя таварышы вылучаюцца для выступленьняў на прадпрыемствах г. Менску ў дні сьвят 1-га мая. Усім сакратаром п/к і парт'ячэек прапануецца дагаварыцца абмесцы і часе выступленьняў з вызначанымі таварышамі. Савецкія ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна. 28 красавіка, а 6-й гадз. веч., у залі Менгаркому (вул. Карла Маркса, 14) адбудзецца нарада вылучаных таварышоў. На нараду абавязан зьявіцца і рэзэрв. Шпэктараў — зав. імя Варашылава, Кавальчук — зав. «Каагупар», зав. «Бальшавік», Карбоўскі — зав. імя Молатава, Гаруновіч — ф-ка «Камунарка», Кудрасу — зав. «Ударнік», Хадасевіч — гута, Дунец — абутковая фабрыка, Домараў — хлебазавод, Чарвякоў — ф-ка «Кастрычнік», Грыцкевіч — шчотачная ф-ка, Бегачоў — друк. імя Сталіна, Люцько — мясакамбінат, Гаўштайн— зав. «Беларусь», Кац — хэмфармзавод, Рутэнбэрг — сьвітэрзавод, Іткін — «Чырв. хэмік», Ермакоў — ф-ка Ушаль, Шапукоў — Белсамапрамсаюз, Міхайлаў — ЦЭЦ, Прыходзька — цагельні, Некрашевіч — Саюзтрэйс, Загаруйскі — транспартны трэст, Гайлянскіх — Белдзяржбуд, Карапеўскі — Менбуд, Пінхасік — садакавал, Сяпожнікаў — таржыласаюз, Фрадзін — дом Ураду, Гарыч — цяга, Казядаў — «Полымя рэвалюцыі», Таруцінскі — служба руху, Валодзька — малы рам. вагонаў, Зічк —служба шляху, Курціх — Эльвод, Войкаў — зав. «Пралетары», Кейлін — «Чырв. зорка», Дубавецкі — «Беларуска», — Гольдштейн — «Чырв. тэкстыльшчык», Дубіна — сувязь, Нісенбаум — шпалерная фабрыка, Мітлін — купнэрная фабрыка, Залатухін — ф-ка 8 сакавіка, Опараў — ф-ка «Усход», Саевіч — фабрыка імя Крупскай, Мэероніч—плямцавая фабрыка, Трос — харчавікі, Бэнэк — полк ДПУ, Шапіра — № стрэл. полк, Горын — № арт. полк, Кавальчук — вучэбн. выд., Шпэктараў — № кав. дыв., Кеніг — № кав. дыв., Карапеўскі — № кав. дыв., Валодзька — № кав. дыв., Карапеўскі — міліцыя. Рэзэрв: Атуньнік, Шэлог, Засьцянкер, Стракоўскі, Старавойтаў, Будзін, Марлёна, Файнбург, Рудзінскі, Слонім, Фрыдман, Радзецкі, Альперовіч, Канаплін, Лабадаеў, Гурэцкі, Левін (Камвуз), Якаўлеў (інст. гіст. парт.), Палякоў (інст. гіст. парт.), Палякоў (МЦРЮ).

— 26-IV, у 7 гадз. веч., у Доме Камасьветы адбудзецца даклад пралетаўніка Маскоўскага таварыства залуўнічых дылектыкаў-марксыстаў т. Ольміна для навуковых працаўнікоў, прапагандыстаў, выкладчыкаў грамадазнаўства каэдр навучальных устаноў і для партактыву г. Менску на тэму: «Ленінскі этап у разьвіцьці дыялектычнага матэрыялізму». Уваход па разданых білетах. Білеты можна атрымаць у культпропе таркому і Доме Камасьветы з 10 да 4 гадз. дня.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Апошнія дні прыёму падпіскі на „ЗЬВЯЗДУ" на МАЙ.

КАВ НЯ БЫЛО ПЕРАПЫНКУ Ў АТРЫМАНЬНІ ГАЗЭТЫ З 1 МАЯ, ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на „Зьвязду" СЁНЬНЯ-Ж!

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ на 12-томнік

твораў Леніна

НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

Выданьне 12-томніка твораў Леніна на беларускай мове значна затрымалася.

Згодна пастановы пленуму ЦК КП(б)Б,

выданьне твораў Леніна будзе скончана ў 1932 г

Выпушчаны з друку 3 і 5 том і хутка выйдзе 4 том.

З мэтай ўпарадкаваньня дастаўкі твораў Леніна, прымаючы пад увагу, што значная колькасьць падпісчыкаў зьмянілі месца жыхарства і не паведамілі новыя адрасы,

З 5-га МАЯ ПА 5-е ЧЭРВЕНЯ АБВЯШЧАЕЦЦА

перарэгістрацыя падпісчыкаў.

Усім падпісчыкам належыць даслаць наступныя весткі: Прозьвішча, імя і імя па бацьку, № заказу і дата, сума задатку, якія тамы атрыманы і падрабязны адрас.

Паказаныя весткі ў выразным выглядзе павінны быць накіраваны па адрасе: Менск, пляц Волі, 5, Сэктар Кнігагандлю Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі.

У выпадку неатрыманьня паказаных вестак, падпісчыкі будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі са складу падпісчыкаў на 12-томнік твораў Леніна.

Сэктар Кнігагандлю ДВБ.

ЧЫРВОНЫ ШАНЧЭН

Нядаўна ў адным з тэлеграфных паведамленьняў ТАСС коратка адзначаўся даклад «генэрала Чэн Яо-ханя — камандзіра 68 белай дывізіі, што стаяла ў паўднёва-ўсходнім Хэнані, які як вядома, уваходзіць у склад славутай Хэнань-Хубэй-Аньхуэйскай савецкай вобласьці. У нядаўна атрыманых кітайскіх газэтах генэральскі даклад, вярнай нарыс апублікован поўнасьцю. Ніжэй мы даем у перакладзе ўсё істотнае з гэтага цікавага дакуманту.

«У жніўні месяцы 1931 г., — расказвае генэрал Чэн-Яо-хань, — мая дывізія была пераведзена ў Шанчэн. Горад яшчэ насіў сьляды прабываньня ў ім камуністаў. Вышэйшая адміністрацыйная ўстанова — павятовы Ямынь прадстаўляў сабой груду руін.

Шанчэн займае плошчу ў 5-6 кв. лі і з усіх бакоў акружан гарамі. Раней ён налічваў ня больш 2 тыс. сем'яў. Цяпер, з прычыны бязупыннага наплыву бежанцаў з усяго павету, яго насельніцтва павялічылася ў шмат раз. У горадзе няма, здаецца, ніводнай вольнай нічыёны. Ужо за некалькі лі ад гарадзкіх сьцен пачынаецца чырвоны раён.

Пасьля прыбыцьця на месца назначэньня, я неадкладна выпрацаваў плян ваенных апэрацый і паступова пачаў прыводзіць яго ў жыцьцё. Ужо атрымаў сякія-такія рэзультаты. Нечакана чырвоныя, даведаўшыся, што ў мяне ўсяго толькі адна дывізія, сканцэнтравалі некалькі дзесяткаў тысяч чалавек і асадзілі Шанчэн. Аблога цягнулася 3 дні. Мая дывізія ўвесь час упарта супраціўлялася. Калі падыйшлі падмацаваньні, чырвоныя зьнялі аблогу.

Галоўнай ваенай сілай чырвоных зьяўляецца Чырвоная армія, пасьля ідуць партызанскія атрады, арганізаваныя з людзей 30-цігадовага ўзросту і старэй, нарэшце, Чырвоная гвардыя, куды ўваходзяць усе фізычна моцныя маладыя людзі чырвонага раёну. Апрача таго ёсьць піянэрскія атрады, жаночыя атрады і палітычныя аддзелы, куды адпалкава ўваходзяць і мужчыны і жанчыны.

Чырвонагвардзейцы ўзброены парэўнальна добра, абмундыраваны таксама добра. Б'юцца дасканала, зброя партызанскіх атрадаў складаецца пагалову з вінтовак, пагалову з мячоў. Большасьць партызан носіць цывільную вопратку. Чырвонагвардзейцы ўзброены чым прыдзецца: паляўнічымі стрэльбамі, мячамі, жалезнымі пікамі, рыдлёўкамі і г. д. На іх абавязку ляжыць ахова чырвонага раёну і разьведка. У часе бойкі яны ідуць у авангардзе. Піянэрскія атрады арганізуюцца з падросткаў абодвух полаў. На фармаваньне іх ідэйнай зкарачаецца вялікая ўвага. Яны цалкам прасякаюцца «ерэсью» камунізму і робяцца непрымірымага пораву. Калі пачынаюцца ваенныя дзеяньні, яны нясуць разьведку, складаюць ударныя перадавыя атрады, вядомыя пад назвай «малады авангард». Многія з іх ахвяруюць сваё жыцьцё, але і паміраючы не прызнаюць сваёй віны. Страшна падумаць, як глыбока прасякнута іх камуністычная «ерэсь»!

На абавязку палітаддзелу ляжыць прапаганда. Жаночыя атрады ў большай частцы арганізаваны з маладых жанчын. Яны даглядаюць за параненымі. Больш старыя звычайна займаюцца гатаваньнем ежы.

У яшчэ несаветызаваныя вёскі і сёлы камуністы спачатку пасылаюць прапагандыстаў, потым па сцэну зьяўляюцца партызанскія атрады і праводзяць беспарадкі (?), прымушаючы ўсіх падпачальвацца чырвонаму рэжыму.

У багатых адбіраецца зямля і хлебныя запасы. З выгляду камуністы, як быццам, імкнуцца скінуць заможных і прыйсьці на дапамогу бедняком. Просты цёмны народ лічыць іх мэтады падзвычай добрымі.

Пасьля скончаньня перапісу насельніцтва і вучасткаў зямлі вызначаюцца межы повага чырвонага раёну і ўстанаўляецца савецкі ўрад, старшынёй якога выбіраецца які-небудзь галадранец. Потым фармуецца зямельны камітэт, арганізуецца чырвоная гвардыя, камандаваньне якою даручаецца якому-небудзь прахадзімцу, піянэрскія і жаночыя атрады, пікеты і малады авангард. Усё насельніцтва разьмяркоўваецца адналедна ўзросту і характару. Такім чынам, жонка разьдзяляецца з мужам і сын з бацькам (гэта так здаецца генэралу таму, што бацька, моў, чырвонагвардзеец, сын піянэр, а жонка ў жаночым атрадзе даглядае параненых).

Калі адбываюцца сходы, адных прымушаюць стаяць на варце, другіх пасылаюць у якасьці вартавых. У народу не застаецца вольнага часу. Шырокія палі прыходзяць у запынад».

Тут генэрал яўна скажае факты. Калі ў тым ці іншым месцы «шырокія палі прыходзяць у запынад», дык прычынай гэтага зьяўляецца не грамадзкае жыцьцё, якое б'е крыніцай у савецкіх раёнах, а спусташэньні, што робяцца белымі войскамі і памешчыкамі, якія ў бясьсільнай злосьці псуюць пасевы і зьнішчаюць ураджай.

«Толькі страту зброі камуністы разглядаюць, як паражэньне. Кожны раз у часе ваенных дзеяньняў паперадзе ідзе чырвоная гвардыя, за ёю партызанскія атрады і, нарэшце, чырвоная армія. Страты ў радох апошняй папаўняюцца партызанамі, страты ў радох партызан — чырвонагвардзейцамі. Калі ўрадавыя войскі прыкметна стамляцца, тады ў атаку супроць іх кідаюцца адборныя часьці Чырвонай арміі.

Першыя выступленьні камуністаў адносяцца яшчэ да 1928 году. Тады ў іх было ня больш 18 вінтовак. У пачатку яны саветызавалі толькі вёскі, не нападаючы на павятовы горад. Павятовы начальнік, які клапаціўся толькі аб бясьпечнасьці гораду, ніяк не дапосіў, што ўсё абстаіць добра, утойваючы сапраўднае становішча. Калі ўтойваць стала немагчымым, «пажар ужо пашоў гуляць па стэпах».

«Звычайна з прыбыцьцём карнай экспэдыцыі чырвоныя ня ўступаюць у бой з буйнымі часьцямі, але, выкарыстоўваючы кожную памылку праціўніка і кожны спрыяючы выпадак, захватваюць пры дапамозе чырвонай гвардзі зброю.

Камандзіры ўрадавых войск звычайна перапавялічваюць свае посьпехі, у тоскім даныясоньні, паведамляючы, што імі, моў, расстраляна столькі і столькі «разбойнікаў» і адабрана нямала зброі. Гэта, зразумела, не перашкаджае сілам чырвоных расьці з кожным днём.

Апрача таго, пэнсію і харчы экспэдыцыйныя войскі атрымліваюць нерэгулярна, ад чаго церпяць ня толькі салдаты, але і камандны склад. Камуністы, карыстаючыся гэтым, вядуць энэргічную прапаганду.

У часе аблогі камуністамі Шанчэну, я быў на пазыцыі, якая знаходзілася ў горах за некалькі кілёмэтраў па поўнач ад гораду. Праціўнік знаходзіўся ад нас літаральна за некалькі крокаў. Сьмех і гутаркі былі выразна чутны. Чырвонае камандаваньне штодзенна высылала людзей весьці прапаганду сярод нашых салдат. Яны хвалілі Чырвоную армію. Гучна выкрыквалі лёзунгі.

Неяк адна камуністка з палітаддзелу ўзьлезла на гару і гучна зьвярнулася да маіх падначаленых:

«Ці любіце вы пяяньне? У мяне добрыя песьні. Ці любіце вы скокі? Я добра скачу».

Салдаты жартам адказалі: «І песьні любім і скокі. Просім сьпяваць і паскакаць».

Праз некаторы час зьявілася другая дзяўчына. Стаўшы поплеч адна да адной, абедзьве дзяўчыны пачалі сьпяваць і скакаць. Пасьля анлёдыравалі адна другой і пачалі весела сьмяяцца. Рантам нашы салдаты (?) далі залп. Дзяўчыны зьбялелі і сумна зьйшлі».

Генэрал знаходзіць гэту падзею надзвычай цікавай...

«З прычыны адсутнасьці адзінага камандаваньня, вайсковая часьць, пасёўшы значныя страты, з трудпасьцю можа разьлічваць на ўкамплектаваньне. Кожны карны атрад жыве ў пастаянным спалоху і думае толькі аб тым, каб захаваць свае сілы, а таму займае пэйтральную пазыцыю, спадзяючыся, што чырвоныя на яго не нападуць. Гэта дае апошнім магчымасьць разьбіваць нашы войскі на часьцях. Вось чаму, хоць у сучасны момант на стыку правінцый Хэнань-Хубэй-Аньхуэй апэруе ня мала карных экспэдыцый, учора мы даведаліся аб тым, што камуністамі абязброен той ці іншы полк, а сёньня тая ці іншая брыгада.

За час майго прабываньня ў Шанчэне, — гаворыць у заключэньне генэрал, — я мог асабіста пераканацца, якую небясьпеку прастаўляе камунізм. Калі хутка ня прыняць супроць яго заходаў, ён можа праглынуць усю краіну. Вось чаму, я глетзячы на ўсялякія клопаты, я парашыў апісаць усё, што мне давялося ўбачыць і пачуць, і пасьля апублікаваць у газэтах, каб паперадзіць бацькоў і братоў усёй краіны быць на варце».

А. І.

„ГЕРОЙ ПРАЦЫ" ЗА 1 КВАРТАЛ НЕДАДАЎ 2270 ТОН ПАПЕРЫ

Буйнейшая ў БССР папяровая фабрыка «Герой працы» у мінулым годзе цыянальнага выкарыстоўваньня катлаў і новых сілавых установак.

Адсутнасьць праверкі выкананьня выклікае безадказныя адносіны да работы. У гэтым корань многіх непаладкаў на фабрыцы. На сходзе рабочых у лютым месяцы інжынэр Шпігельман ад імя тэхнічнай камісіі, якая абсьледавала становішча забясьпячэньня фабрыкі торфам, запэўніў, што фабрыка да жніўня мае выстарчальную колькасьць добраякаснага торфу. Праз пекаторы час выявілася, што торфу не хапае. Такія безадказныя адносіны да важнейшага пытаньня, такое агіднае «очковтирательство» не атрымалі належнага адпору з боку фабрычных арганізацый.

Паводле пастаноў дырэктыўных органаў для фабрыкі адпушчана 125 тыс. кбм. дроў. Да 20 сакавіка трэба было ўсталяваць цыркуляркі для піленьня дроў, пад'ёмнік і забясьпечыць рубку рабочай сілай. Аднак, да красавіка не прыступілі да гэтай справы (знайшлася «аб'ектыўная» прычына — ад'езд дырэктара тав. Калпінскага ў Менск). Нават зараз па загатоўцы дроў працуе 8-12 чалавек замест 25, тэмпы іх работы вельмі нізкія, бо не праведзена зьдзельшчына. Выпік — перабоі ў снабжэньні апалам качагаркі і недадача дзесяткаў тон паперы. Страты тут можна тлумачыць выключна нядбайнасьцю і безгаспадарчасьцю адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Да апошняга часу ня зроблен новы пад'ёмнік для падачы дроў.

Трэба адзначыць, што прапановы брыгады ЦК КП(б)Б і гомельскага РК КП(б)Б па фабрыцы дагэтуль не рэалізаваны. Не ажыцьцёўлен рад дырэктыў парткому і фабкому, бо няма праверкі выкананьня, няма адказнасьці за работу.

Далей так працаваць нельга. Папяровая фабрыка «Герой працы» павінна напружыць усе сілы і бальшавіцкімі тэмпамі дабіцца выкананьня плану другога кварталу. Гэтага патрабуюць ад яе задачы разгортваньня культурнай рэвалюцыі.

Палярны.

УСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ, аб'яднаньням і трэстам лёгкай прамысловасьці.

Выдавецтва газэты „ЛЕГКАЯ ИНДУСТРИЯ" прыступіла да выданьня

„Сборника постановлений и приказов по легкой промышленности СССР".

Загады і цыркуляры, якія выпушчаны з моманту стварэньня НКЛП, увайдуць у першы зборнік.

Падпісная цана: на 6 м-цаў—10 р., на 9 м-цаў—15 р., на 12 м-цаў—20 р.

Заказы і падпісную плату накіроўвайце па адрасе: Москва, Пушечная, 4, „Легкая Индустрия".

Заказы, якія паступілі без падпісных сум, выконвацца ня будуць.

Першы № выйшаў з друку і рассылаецца падпісчыкам.

Выд-ва „Легкая Индустрия".

кіно Чырвоная Зорка Ад 26-IV

НОВЫ МАСТАЦКІ САВЕЦКІ ФІЛЬМ

ЧОРНАЯ СКУРА

Драма у 6 частках.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Мэры . . . . . В. Каралёва
Сэм . . . . . В. Гоналяко
Том . . . Кадор-Бэн-Сэлім
Крэмнеў . . . С. Мінін і інш.

Звыш праграмы кіно-хроніка „За сацыялістычную Беларусь"

Пачатак у 6 г., 7-30, 9 і 10-30. Каса—ад 1 г. дня.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.

1-я усебеларуская канфэрэнцыя ІТР

саюзу чыгуначнага, шасейнага і партовага будаўніцтва

адбудзецца у г. Нова-Барысаве.

Адкрыцьцё канфэрэнцыі 28 красавіка у 7 гадз. вечара

Рэгістрацыя дэлегатаў будзе праводзіцца у канторы нач. 5-га дарожна-будаўнічага вучастку (Чыгуначная вул.)

Прэзыдыум РБ ІТС

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Мастацкі фільм вытворч. УСХОДКІНО ІГДЭНБУ

ПРАЛЕТАРЫ — Адкр. з 12 г. дня — ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ САПРАЎДНЫЯ ПАНЫ ў 8 частках.

СПАРТАК — Пачатак: 7 г., 8-15, 9-30, 10-45 — Замежны фільм НАЧНЫ КРЫК. Звыш праграмы Навука і тэхніка у 1 ч.

Адкрыт ПРЫЁМ ЗАЯЎ на прыродазнаўчае аддзяленьне Магілёўскага завочнага педагагічнага інстытуту.

Працягнут прыём на сац.-гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьні

Заявы накіроўваць да І-У на адрасе: Магілёў, БССР, Ленінская, 35, завочны падінстытут.

Завочны сэктар.

КАНТОРА па пабудове птушка-камбінату ў гор. Жлобіне „МЯСАХЛАДБУД" а 1-га красавіка г. г. ЛІКВІДУЕЦЦА.

Установы, прадпрыемствы і прыватныя асобы, якія маюць прэтэнзіі да „МЯСАХЛАДБУДУ", павінны прадставіць гэткія ў кантору „Мясахладбуду" на птушка-камбінаце ў гор. Жлобіне ў 2-тыднёвы тэрмін са дня гэтай абвесткі.

Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Нач. будаўніцтва Шыпаў.
Ст. бухгальтар Прошчанка.

Жлобінская школа ФЗВ птушка-прамысловасьці

абвяшчае, што прыём заяў на весняны набор у школу працягваецца да 29 красавіка.

Прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме 6-7